

ЖАРТЫ МОГУЦЬ ДРЭННА СКОНЧЫЦЦА

4

НЯЎЛІЧАНЫЯ ЖЫЦЦІ: БАЗА ПАПАЎНЯЕЦЦА

МС




Выдаецца з 9 жніўня 1917г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 САКАВІКА 2022 г.
СЕРАДА
№ 61 (29683)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ


**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Аляксей БАГДАНАЎ, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю:**

*«Таварамі, якія вырабляюцца ў Беларусі, мы забяспечаны з вялікім запасам. А што да імпартных, то, паверце, нашы імпарцёры, наш бізнес не спяць у шапку. Мы ўжо праходзілі ковідныя часы. І зараз усе сарыентаваны на аператыўную, хуткую работу. Калі раней мы гаварылі аб экспартнай дыверсіфікацыі, то сёння — аб дыверсіфікацыі імпарту. І калі ў нейкіх краінах нешта немагчыма купіць — вязём з іншых і аптымізуем ланцужкі паставак».*

## КОРАТКА

- **Базавая арэндная велічыня знізіцца да Br16,9.**
- Рэтраспектыву работ мастака-рамантыка XIX стагоддзя Эжэна Дэлакруа прадставяць у Мінску.
- **Кансультацыя па працоўным праве для моладзі адбудзецца 30 сакавіка. Яна пройдзе ў фармаце стрыму ў цэнтральным пабліку БРСМ у сацыяльнай сетцы Instagram.**



- Першыя сёлета абмежаванні на наведванне лясоў уведзены ў васьмі раёнах Беларусі.
- **МТЗ, «Гомсельмаш» і Пецярбургскі трактарны завод створаць Саюз прамыслоўцаў.**
- Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур пройдзе ў Гродне 3—4 чэрвеня.

ISSN 1990 — 763X

# БУДАЎНІКІ ПТУШЫНАГА МІКРАРАЁНА



Ляснік Аляксандр ГРАКОВІЧ і лесаруб Сяргей БАТУРА працуюць у Смалявіцкім лясгасе. Сёлета мужчынам даверана адказная і душэўная праца — рабіць і развешваць домікі для птушак. Болей за сто трыццаць новых сінічнікаў (згадзіцеся, цэлы мікрараён!) з'явіцца ў лясных кварталах Усяжскага лясніцтва — менавіта тут шчыруюць нашы героі. А гэты здымак быў падгледжаны на лясістай узбочыне дарогі каля вёскі Тадуліна.

У Смалявіцкім лягасе працуе сем лясніцтваў, і кожнае з іх, з надыходам вясны, будуе для іх птушак дзясяткі, нават сотні новенькіх кватэр.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Актуальна

## ВОЛАТЫ ПАД ПАГРОЗАЙ

### Як польская граніца дзеліць па-жывому папуляцыю белавежскіх зуброў

**Навукоўцы і грамадскасць працягваюць біць трывогу. Занепакоенасць выклікаюць тыя наступствы, якія могуць напаткаць Нацыянальны парк «Белавежская пушча», калі яго раздзяліць высокай стальной агароджай. Асаблівую заклапочанасць эколагі звязваюць з далейшым лёсам зуброў. Іх папуляцыя ў прамым сэнсе будзе раздзелена на дзве паловы. Супраць будаўніцтва агароджы на беларуска-польскай граніцы ў Гродзенскай вобласці сабрана каля 1,5 тысячы подпісаў.**

СТАР. 3



Будзьце пільныя!

## У ВЕЛАЗЛАДЗЕЯЎ — ГАРАЧАЯ ПАРА

### Як засцерагчы свой транспартны сродак ад крадзяжоў?



**Дачакаўшыся першых цёплых дзён, многія з нас не толькі дасталі з шафы вясеннюю вопратку, а і паспяшаліся выцягнуць з лоджый, падвалаў і гаражоў веласіпеды. Аднак, падрыхтаваўшы іх да сезона і нават ужо прымяніўшы па прызначэнні, некаторыя веласіпедысты забыліся пра адну вельмі важную дэталь — паклапаціцца аб захаванасці свайго транспартнага сродку.**

СТАР. 3

З першых вуснаў

# «ГЭТА СУПРАЦОЎНІЦТВА ЗАЎСЁДЫ ПРЫНОСІЛА І БУДЗЕ ПРЫНОСІЦЬ КАРЫСЦЬ»

**Прэзідэнт Беларусі абмеркаваў з паслом В'етнама Нгуенам Ван Нгы гістарычную памяць і супрацоўніцтва ў сучаснай эканамічнай сітуацыі.**

«Не ўсё так дрэнна ў нашым свеце. Ёсць месцы, дзе ціха і спакойна. Я маю на ўвазе і наш сяброўскі В'етнам. Народ В'етнама заслужыў гэту цішыню і той рост дабрабыту, забяспечанасці насельніцтва, развіцця В'етнама. Вы прайшлі вельмі складаныя часы», — пачаў размову Аляксандр Лукашэнка.



Фота БелТА.

Ён заўважыў, што памятае цяжкія часы ў гісторыі В'етнама і заўсёды нагадвае, калі гаворка заходзіць пра гэту дзяржаву, пра барацьбу народа супраць тых, хто хацеў знішчыць краіну і асталявацца ў гэтым стратэгічна важным раёне Паўднёва-Усходняй Азіі.

Па яго словах, наша краіна будзе рабіць усё, каб В'етнам развіваўся. «Гэта не толькі таму, што мы любім в'етнамскі народ, але і таму, што гэта з боку гледжання эканомікі выгадна. Прагматызм характэрны і для нашага народа, і для в'етнамскага народа, нашых дзяржаў. Гэтае супрацоўніцтва заўсёды прыносіла і будзе прыносіць карысць», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што сумесны тавараабарот па выніках 2021 года склаў каля 200 мільёнаў долараў. Але дадзены паказчык можа быць і большым. «Мы поўныя рашучасці развіваць наша супрацоўніцтва ў сферы эканомікі. Гэта фундамент нашых адносін. Вы ведаеце нашы магчымасці. Мы будзем імкнуцца да таго, каб нашы тэхналогіі пераносіць на тэрыторыю В'етнама, стварыць там сумесныя прадпрыемствы па вытворчасці аб'ектаў машынабудавання, прадуктаў машынабудавання. Я маю на ўвазе і МТЗ, і МАЗ, і БелАЗ», — пералічыў пункты росту Прэзідэнт.

Гатовыя, паводле яго, мы супрацоўнічаць з азіяцкай краінай у пастаўках прадуктаў харчавання, мінеральных угнаенняў.

«Я ведаю, што мы сертыфікацыю некаторых нашых прадуктаў харчавання праводзім там. Хацелася б, каб гэта ішло больш аператыўна. Сёння хацеў бы з вамі абмеркаваць перспектывы нашага супрацоўніцтва», — дадаў кіраўнік краіны.

Аляксандр Лукашэнка мяркуе, што ў хуткім часе адбудзецца візіт беларускага прэм'ер-міністра ў В'етнам, дзе ў дэталях абмяркуюць вынікі супрацоўніцтва мінулых гадоў і перспектывы далейшага ўзаемадзеяння.

«Я хачу, каб вы ведалі: В'етнам заўсёды быў нашым сябрам і ім застанецца. Гэта галоўнае», — рэзюмаваў беларускі лідар.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### Каментарый у тэму

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам у Рэспубліцы Беларусь Нгуен Ван Нгы: «За кароткі час перагавораў мы падвялі вынікі нашага супрацоўніцтва і абмеркавалі перспектывы пашырэння і ўмацнення адносін у розных галінах. Калі казаць пра перспектывы, ёсць вялікі патэнцыял, каб падвоіць тавараабарот і аднавіць яго да даковідных часоў. Мы будзем далей прыкладаць намаганні, каб узмацняць і пашыраць супрацоўніцтва».

**Сёлета Беларусь і В'етнам адзначылі 30-годдзе ўсталявання дыпламатычных адносін. За гэты час паміж дзяржавамі праходзіў абмен візітамі на найвышэйшым і высокім узроўнях, развіваецца ўзаемадзеянне ў міжнародных арганізацыях.**
**У 2021 годзе Беларусь экспартавала ў азіяцкую краіну калійныя ўгнаенні, прадукцыю жывёлагадоўлі, вырабы прыборабудавання, лекі і касметыку. Закуплялі беларусы ў В'етнаме каўчук, арэхі, рыбнае філе, інтэгральныя схемы, палімеры прапілену, кансерваваныя прадукты.**
**У В'етнаме працуе зборачная вытворчасць грузавікоў МАЗ. Прапрацоўваюцца пастаўкі спецыяльных трактароў «Беларус» для работы на рысавых палях, кар'ернай тэхнікі БелАЗ. Ёсць дамоўленасці аб будаўніцтве прадпрыемства па вытворчасці малака і малочнай прадукцыі.**

Парламенцкі дзённік

## СУПРАЦОЎНІЦТВА — НА ВЫСОКІМ УЗРОЎНІ

### Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА сустрэўся з паслом Сірыі ў Беларусі Махамадам аль-Умрані

**Як адзначыў Старшыня Палаты прадстаўнікоў, за час работы пасла ў нашай краіне назіраецца станоўчая дынаміка кантактаў у шматлікіх сферах двухбаковага ўзаемадзеяння.**

Як падкрэсліў спікер Палаты прадстаўнікоў, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка асабіста ўдзяляе самую пільную ўвагу развіццю адносін з Сірыяй. «Гэта датычыцца не толькі палітычнай, гандлёва-эканамічнай дзейнасці, а і гуманітарнай, — удакладніў Уладзімір Андрэйчанка. — Пад патранажам кіраўніка дзяржавы рэалізоўваецца праект па аздараўленні і лячэнні сірыйскіх дзяцей у Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня». За апошнія пяць гадоў там прайшло аздараўленне каля тысячы сірыйскіх дзяцей».

Акрамя таго, Старшыня Палаты прадстаўнікоў звярнуў увагу на ўмацаванне міжкультурных сувязяў дзвюх краін, а таксама немалую ролю ў двухбаковым супрацоўніцтве заканадаўчых органаў Беларусі і Сірыі.

— Адносіны паміж дзвюма краінамі на палітычным узроўні вельмі моцныя, а кіраўнікоў нашых дзяржаў звязваюць моцныя сяброўскія сувязі, — заўважыў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Сірыйскай Арабскай Рэспублікі ў Беларусі Махамад аль-УМРАНІ.** — Мы імкнёмся да развіцця супрацоўніцтва і ў іншых сферах: эканамічнай, культурнай і парламенцкай. Важна, каб яны дасягнулі такога ж узроўню супрацоўніцтва, які мы маем у палітычнай сферы. На працягу апошніх дзесяці гадоў Сірыя цярпела ад наступстваў вайны, развязанай супраць яе. Мы вельмі высока цэнім пазіцыю Рэспублікі Беларусь, якая падтрымлівала нас на працягу гэтага часу. Ваша краіна таксама адчувае на сабе аналагічны ціск, які заключаецца ва ўвядзенні санкцый, эканамічнай блакадзе. Мы салідарныя з Беларуссю ў супрацьстаянні гэтым мерам у выглядзе санкцый. Са свайго боку, прыкладзём усе намаганні для развіцця двухбаковых адносін.

**Вераніка КАНЮТА.**

Інтэграцыя

## САЮЗНЫЯ ПОРТЫ Ў ГОРАДЗЕ НА НЯВЕ

**Бізнес-форум, перагаворы, харчовая выстава і кантракты — гэтыя мерапрыемствы ў графіку рабочага візіту прэм'ер-міністра Беларусі ў Санкт-Пецярбург.**

Раман Галоўчанка перш-наперш адкрыў Беларускі харчовы форум у горадзе на Няве, дзе запэўніў, што ніякіх перабояў у забеспячэнні харчаваннем у Беларусі і Расіі не прадбачыцца, перадае прэс-служба Савета Міністраў. «Упэўнены, што нават у існуючай цяпер няпростай сітуацыі ніякіх перабояў у забеспячэнні харчаваннем ні ў Беларусі, ні ў Расіі не прадбачыцца. Мы самадастатковыя ў гэтым плане дзяржавы. Мы ўмеем і ведаем, як працаваць на зямлі, як зрабіць для нашых людзей якасную добрую ежу. І ў гэтым плане мы ўзаемадапаўняем адно аднаго. Тым не менш, ёсць новыя выклікі, якія нам трэба парыраваць. Нам трэба станавіцца больш мабільнымі, больш гібкімі адно да аднаго, шукаць новыя формы рэагавання на змены на рынку харчавання», — сказаў Раман Галоўчанка.

У Смольным кіраўнік беларускай урадавай дэлегацыі сустрэўся з губернатарам Санкт-Пецярбурга Аляксандрам Бегловым.

«Абстаноўка вакол нашых краін істотна змянілася з прычыны вядомых абставін. Знешні санкцыйны ціск узмацніўся шматразова. Калектыўны Захад праводзіць адносна нашых краін непрыхаваную палітыку эканамічнага ўдушэння. Таму наша эфектыўнае гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва — неабходная ўмова паспяховага супрацьстаяння эканамічнай вайне супраць Саюзнай дзяржавы», — перадае словы Рамана Галоўчанкі БелТА.

Прэм'ер-міністр таксама адзначыў, што ў 2021 годзе Беларусь і Санкт-Пецярбург дасягнулі значных аб'ёмаў тавараабароту, і падкрэсліў, што сёлета трэба перавысіць лічбы мінулага года.

Паводле кіраўніка Саўміна, ва ўмовах санкцыйнага ціску і фактычна транспартнай блакады Беларусі вельмі важна выйсці на поўнамаштабнае выкарыстанне марскіх партоў Расіі — у прыватнасці, шматфункцыянальнага портавага комплексу Бронка. «Гэта цудоўнае лагістычнае прадпрыемства, якое валодае ўсімі запатрабаванымі характарыстыкамі для перавалкі часткі беларускіх грузаў. Цяпер задача — выйсці на прымальную эканоміку», — мяркуе Раман Галоўчанка.

Сёння прэм'ер-міністр сустрэнецца з кіраўніцтвам порта Бронка для абмеркавання актуальных пытанняў перавалкі беларускіх грузаў.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Мядзінскі расказаў аб кроках па дээскалацыі



**Масква робіць два крокі насустрач Кіеву па дээскалацыі канфлікту, заявіў кіраўнік дэлегацыі РФ, памочнік прэзідэнта РФ Уладзімір Мядзінскі, паведамляе ТАСС.**

«Я магу са свайго боку сказаць, што мы таксама робім два крокі па дээскалацыі канфлікту насустрач», — сказаў ён журналістам. Уладзімір Мядзінскі растлумачыў, што гэтыя крокі датычацца палітычнай і ваеннай частак.

Памочнік прэзідэнта РФ таксама адзначыў, што расійская дэлегацыя атрымала ў Стамбуле ад украінскага боку зразумела сфармуляваную пазіцыю і прапановы, якія будуць вывучаны і даведзены да кіраўніцтва краіны. «Мы атрымалі прапановы з боку Украіны для разгляду, дакладна сфармуляваную іх пазіцыю па ўключэнні ў дагавор. Гэтыя прапановы будуць разгледжаны ў найбліжэйшы час і выкладзены Прэзідэнту. І будзе дадзены адпаведны наш адказ», — адзначыў Уладзімір Мядзінскі.

Ён таксама заявіў, што сустрэча Пуціна і Зяленскага магчымая адначасова з парафіраваннем мірнага дагавора кіраўнікамі МЗС. «Мы пасля сённяшняй змястоўнай размовы ўзгаднілі і прапануем рашэнне, па якім сустрэча кіраўнікоў дзяржаў магчыма адначасова з парафіраваннем дагавора міністрамі замежных спраў, тым больш што ў момант гэтага парафіравання і разгляду дэталяў дагавора магчымае абмеркаванне розных палітычных нюансаў і дэталяў», — сказаў Уладзімір Мядзінскі аб выніках расійска-ўкраінскіх перагавораў у Стамбуле.

Перагаворы, якія прайшлі ў Стамбуле, сталі першай вочнай сустрэчай дэлегацый Расіі і Украіны з 7 сакавіка.

### Fox News: Байдэн нашкодзіў міжнародным адносінам больш за іншых прэзідэнтаў ЗША

**Прэзідэнт ЗША Джо Байдэн за першы год свайго праўлення нашкодзіў міжнародным адносінам больш, чым хто-небудзь з яго папярэднікаў. Такую пазіцыю выказаў вядучы праграмы The Next Revolution на тэлеканале Fox News Стыў Хілтан.**

Так, Дональд Трамп, які кіраваў Злучанымі Штатамі да Байдэна, умацоўваў саюзы і паспяхова супрацьстаяў КНР. У той час як дзеючы прэзідэнт разбурае эканоміку краіны і ў кожнай замежнай паездцы толькі ганьбіць сябе і дзяржаву, якую ўзначальвае. У якасці прыкладаў тэлевядучы назваў будаўніцтва нафтаправода Keystone XL, вывад амерыканскіх войскаў з Афганістана, разбурэнне сувязяў з многімі краінамі і правакаванне Расіі. Хілтан таксама пракаментаваў заявы міжнародных палітыкаў, якія сцвярджаюць, што гэта Байдэн узначаліў аб'яднанне саюзнікаў па НАТА.

«Хопіць несці лухту. <...> Гэта не Байдэн мабілізаваў НАТА, а Пуцін, якому не падабаецца перспектыва размяшчэння натаўскіх ракет у сябе пад бокам. Байдэн не ўмацоўвае нашы альянсы, а разбурае іх», — заявіў вядучы.

Ён нагадаў аб тым, як Вашынгтон пацярпеў няўдачу ў адносінах з Саудаўскай Аравіяй, Індыяй, КНДР і многімі іншымі дзяржавамі.

# ВОЛАТЫ ПАД ПАГРОЗАЙ




## СЦЯНА СУПРАЦЬ ЗУБРА

Белавежская пушча ганарыцца сваімі зубрамі. Дзякуючы шматгадовай рабоце па аднаўленні папуляцыі менавіта на гэтай тэрыторыі ўдалося стварыць самае вялікае ў свеце пагалоўе гэтай жывёлы.

Роўна 30 гадоў таму Нацыянальны парк як асаблівa ахоўная тэрыторыя быў унесены ЮНЕСКА ў спіс сусветнай спадчыны. Як паведаміў **дэкан факультэта біялогіі і экалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы Аляксандр КАРЭЎСКІ,** на працягу гэтага перыяду ў Беларусі вялася работа па аднаўленні папуляцыі белавежскага зубра, якіх заставалася літаральна некалькі асобін.

Як вядома, частка прыроднага парку знаходзіцца на тэрыторыі Польшчы, нядаўна там распачалося будаўніцтва пагранічнай загараджальнай сістэмы. І гэтая агароджа даволі грунтоўная — металічная канструкцыя вышынёй 5,5 метра. Стальныя слупы ставяцца на бетонны фундамент, а зверху — віткі калючага дроту. Паведамлялася, што на будаўніцтва такой сцяны ўрадам Польшчы ў 2021 годзе выдзелена каля 400 мільёнаў долараў.

Узвядзенне непраходнай перашкоды пачалося на беларуска-польскай граніцы ў канцы снежня. Паводле планаў польскай пагранічнай службы, работы павінны завяршыцца за 150 дзён, гэта значыць да ліпеня.

## ПРЫСТАНІШЧА ДЛЯ ПАПУЛЯЦЫІ

Праз Белавежскую пушчу агароджа пройдзе ажно на 60 кіламетраў. Зразумела, што такі бар'ер нясе пагрозу трансгранічнаму экалагічнаму аб'екту, сістэма якога стваралася стагоддзямі. Пацерпяць ад гэтага многія віды жывёл, асабліва зубры, для якіх пушча стала амаль апошнім прыстанішчам.

— Белавежская пушча — незаменная тэрыторыя для захавання папуляцыі зуброў, — адзначыў **старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў Валянцін ПАЛЯНЧУК.** — На сённяшні дзень колькасць гэтых жывёлін складае тут прыкладна 1,5 тысячы асобін. Адна палова з іх знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі, другая — на тэрыторыі Польшчы. Будаўніцтва агароджы на беларуска-польскай граніцы прывядзе да памяншэння генетычнай разнастайнасці белавежскага зубра. А з цягам часу паставіць пад пагрозу захаванне і самой папуляцыі.

Цяпер, па словах спецыялістаў, у Нацыянальным парку налічваецца 703 зубры. Іх колькасць за год павялічылася амаль на 30 галоў. З польскага боку зафіксавана 779 жывёлін. На беларускім баку пераважная колькасць — самкі: 402, а вось дарослых самцоў толькі 117. Міграцыя вырашае дэмаграфічную праблему папуляцыі.

Агароджа парушыць традыцыйныя шляхі міграцыі жывёл. Як правіла, зімой яны канцэнтруюцца ў вялікіх лясных масівах, дзе ёсць кармавая база, а вось вясной пераходзяць на ўзлескі, палі. Звяры прывыклі да таго, што дарога для іх заўсёды адкрытая. Калі ўзнікае перашкода, яны будуць старацца яе пераадолець. Негатыўныя наступствы можна было назіраць падчас устаноўкі калючай сеткі на граніцы, якая станавілася смяротнай пасткай для аленяў, ласёў і нават зуброў. Статак апошніх прыйшоў з тэрыторыі Польшчы, а потым з-за бар'ера не мог вярнуцца назад. Яны практычна былі асуджаныя на галаданне. Пры спробе прабіцца праз калючы дрот адзін зубр загінуў.

## НАСТУПСТВЫ АДЧУЮЦЬ І ЛЮДЗІ

Экологі расказалі, што на граніцы ёсць службы, якія дапамагаюць жывёлінам. Але пры жорсткім варыянце раздзялення тэрыторыі аказаць дапамогу будзе немагчыма.

«У жывёлін ёсць свой свет існавання, у якім яны прывыклі жыць на працягу дзесяцігоддзяў. Цяпер людзі істотна ўмешваюцца ў іх асяроддзе. Што мы можам атрымаць у выніку? Зуброў, якія ходзяць па дарогах, скаргі мясцовых жыхароў на ваўкоў і рысяў, якія прыходзяць на іх падворкі, — намаляваў карціну хуткага будучага ў ходзе кругл стала **старшыня грамадскага аб'яднання «Экаманіторынг» Яўген ФІЛІМОНАЎ.** — Усё гэта можа выклікаць хаатычныя негатыўныя наступствы».

— Будаўніцтва фундаментальнай агароджы, якое суправаджаецца пэўнай нагрузкай на глебу, на вадаёмы, стварае пагрозу заніравання цэласнай экалагічнай сістэмы Белавежскай пушчы. Да агароджы, якая пройдзе і праз Белавежскую пушчу, будуць пракладвацца дарогі, весціся іншыя фундаментальныя работы, — расказаў «Звяздзе» Аляксандр Карэўскі. — Як у такім выпадку можна ацэньваць уплыў гэтага будаўніцтва на наваколле сусветна вядомага прыроднага комплексу? Надзвычай негатыўна.

У лютым і сакавіку бягучага года ў Гродзенскім рэгіёне прайшоў шэраг круглых сталоў з удзелам грамадскасці і вучоных з заклікам спыніць будаўніцтва агароджы на тэрыторыі Белавежскай пушчы і іншых трансгранічных ахоўных тэрыторыях з польскага боку. На рэзалюцыях у ходзе круглых сталоў сабрана больш за 1,5 тысячы подпісаў. Сваю нязгоду з будаўніцтвам сцяны выказалі многія прыродаахоўныя арганізацыі, абаронцы навакольнага асяроддзя і простыя жыхары.

## «ВОКНЫ» НЕ ВЫРАШАЮЦЬ ПРАБЛЕМУ

Разам з тым будаўніцтва такога значнага і глабальнага аб'екта патрабуе агульнага ўзгаднення навукоўцаў Беларусі і Польшчы. Па словах Аляксандра Карэўскага, згаданая справа атрымала шырокі рэзананс. Неабходнасць спынення будаўніцтва пагранічнай агароджы разумеюць і вучоныя з польскага боку, з якімі праведзена нямала сумесных трансгранічных праектаў адносна Белавежскай пушчы. Гэта і недапушчэнне распаўсюджвання чужародных відаў, і праект па фарміраванні шляхоў міграцыі праз граніцу дзікіх жывёл.

— У дадзеных пытаннях праведзена значная работа з боку навукоўцаў. І хочацца, каб той рэзананс, які выклікалі круглыя сталы, трансляваўся надалей і знайшоў адлюстраванне ў канкрэтных дзеяннях па кансалідацыі намаганняў, — падкрэсліў суразмоўнік.

І адзіны выхад тут бачаць толькі ў тым, каб спыніць будаўніцтва агароджы. Спачатку хоць бы для таго, каб цалкам высветліць уздзеянне такога маштабнага ўмяшання на навакольнае асяроддзе. Дарэчы, з падобнай прапановай у Еўрапейскую камісію па парушэнні Бернскай канвенцыі, якая замацоўвае ахову дзікай фаўны і флоры Еўропы, звярнуліся сотні арганізацый з Беларусі і Польшчы.

— Варта падумаць аб наступствах. Накуль, згодна з праектам, на 186 кіламетраў агароджы прадугледжана толькі дзевяць так званых вокнаў для міграцыі жывёл суседніх дзяржаў. Гэтага надзвычай мала, — заўважыў навуковец.

Па яго словах, дзікім жывёлам знайсці месцы для міграцыі вельмі складана. Тыя ж зубры наўрад ці змогуць адшукваць гэтыя «вокны» падчас гону, гэта значыць шлюбнага перыяду. Тое ж можна сказаць і пра іншых насельнікаў пушчы. А іх тут — ні многа, ні мала — некалькі сотняў відаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# У ВЕЛАЗЛАДЗЕЯЎ — ГАРАЧАЯ ПАРА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

З наступленнем вясны ўсё часцей у органы ўнутраных спраў трапляюць паведамленні аб крадзяжах веласіпедаў. Сёлета гарачая пара для велазладзеяў наступіла раней, чым звычайна. Па стане на 2 сакавіка ўжо здзейснена 159 такіх злачынстваў (летась за аналагічны перыяд — 143). Усяго за 2021 год праваахоўнікі зафіксавалі 2128 фактаў крадзяжу велатранспарту. Большасць правапарушэнняў, як правіла, звязаная з бесклапотнымі адносінамі ўладальнікаў да захаванасці сваёй маёмасці.

— Ці магчыма ўявіць, каб хтосьці пакінуў у пад'ездзе або на вуліцы нейкую рэч коштам у сотні рублёў? — задае рытарычнае пытанне **начальнік арганізацыйна-аналітычнага ўпраўлення міліцыі грамадскай бяспекі МУС палкоўнік міліцыі Вадзім ПЕТЫШ.** — А з веласіпедамі, якія часам каштуюць значна даражэй, такое адбываецца дастаткова часта. Прычым, як паказвае практыка, некаторыя велааматары лічаць дастатковым проста паставіць веласіпед пад акном свайго дома. Калі б уладальнікі не адносіліся так абыякава да свайго двухколавага транспарту, крадзяжоў было б у разы менш. Наяўнасць нават самага простага тросу або ахоўнага прыстасавання павялічвае шанцы на тое, што злодзей пройдзе міма.

Праваахоўнікі не перастаюць паўтараць: захаванасць маёмасці залежыць выключна ад саміх грамадзян. Пакідаючы веласіпед у грамадскім месцы нават на непрацяглы час, варта прывязваць яго тросікам з велазамком. Спецыялісты рэкамендуюць выкарыстоўваць трос максімальнай таўшчыні. Веласіпед неабходна замацоўваць за кола і раму. Калі ж даўжыня троса дазваляе, то за раму і за абодва колы.

Пакідаючы веласіпед у лёгкадаступных для іншых грамадзян месцах, ёсць сэнс забіраць з сабой аксесуары, якія хутка здымаюцца: велакамп'ютар, ліхтар, помпу, іншыя гаджэты. Такі транспартны сродак не складае асаблівай цікавасці для хуліганаў. Найбольшая ж захаванасць забяспечваецца тады, калі ён знаходзіцца ў полі зроку гаспадароў або пад назіраннем відэакамер.


Фота з адкрытых крыніц.

На жаль, як паказвае статыстыка, прадаць скрадзены веласіпед даволі лёгка. Дастаткова і тых, хто гатовы купляць крадзенае. Хоць зразумець, што яно менавіта такое, нескладана: у большасці выпадкаў за яго просяць невялікія грошы, у той час як рэальны кошт транспартнага сродку нашмат большы.

Як нагадвае Вадзім Петыш, набываючы крадзенае, людзі рызыкуюць застацца і без гэтай рэчы, і без кампенсацыі за яе. «Акрамя таго, грамадзяне могуць быць прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці па артыкуле 236 Крымінальнага кодэкса — набыццё або збыт матэрыяльных каштоўнасцяў, загадзя здабытых злачынным шляхам, — удакладніў прадстаўнік міліцэйскага ведамства. — Адказнасць за дадзенае злачынства дастаткова суровая: да шасці гадоў пазбаўлення волі са штрафам».

Калі ж усё-ткі ваш веласіпед скралі, неадкладна паведаміце аб гэтым у міліцыю. Праваахоўнікі рэкамендуюць запомніць месца, дзе гэта адбылося, паспрабаваць знайсці сведкаў здарэння, запісаць іх нумары тэлефонаў і адрасы. Нялішнім будзе размясціць інфармацыю аб скрадзеным транспартным сродку ў інтэрнэце — з яго фотаздымкамі і характарыстыкамі. Неабходна паведаміць аб крадзяжы сваім знаёмым: магчыма, веласіпед трапіць камусьці з іх на вочы. Не забывайцеся і самі праглядаць аб'явы аб продажы ўжываных веласіпедаў — ёсць выпадкі, калі грамадзяне такім чынам самі знаходзяць сваю скрадзеную маёмасць. У гэтым выпадку не трэба дамагацца справядлівасці самастойна, лепш звярнуцца ў міліцыю.

**Веранiка КАНЮТА.**

### Як знізіць рызыку крадзяжу веласіпеда:

- замест звычайнага троса лепш выкарыстоўваць ланцуг або стальны U-падобны замок;
- зафіксаваць колы можна спецыяльнымі блакіратарамі;
- пакідаючы веласіпед, забірайце з сабой усё абсталяванне, якое лёгка здымаецца;
- зрабіце свой транспарт унікальным;
- захоўвайце дакументы на веласіпед (калі яго знойдуць, вы зможаце пацвердзіць, што ён ваш).

Ёсць пытанне

# КАЛІ ЖАРТЫ МОГУЦЬ ДРЭННА СКОНЧЫЦЦА

## Як адрозніць сапраўдную павестку ў ваенкамат ад «ліпавай»?

**У ваенных камісарыятах краіны — гарачая пара. Маладыя людзі, якія не маюць адтэрміноўкі ад воінскай службы, праходзяць медыцынскі агляд, прысутнічаюць на пасяджэннях прызыўных камісій, затым рыхтуюцца да адпраўкі ў армію. Нягледзячы на «ліпавыя» павесткі і фэйкі наконт масавай мабілізацыі, якія ў апошні час нарабілі шуму, мерапрыемствы прызыву ідуць па плане — згодна з Указам Прэзідэнта «Аб звальненні ў запас і прызыве на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве».**

Аб асаблівасцях бягучай прызыўной кампаніі карэспандэнту «Звязды» расказалі ў Кастрычніцкім ваенным камісарыяце г. Мінска. Менавіта прыпісанаму да гэтага ваенкамата ваеннаабавязанаму прыйшла адна з першых ілжывых павестак. Як западозрыць фальсіфікацыю ў гэтым дакуменце, які настрой у будучых вайскоўцаў, а таксама чым пагражае ўхіленне ад воінскай службы, расказаў ваенны **камісар Кастрычніцкага раёна Мінска палкоўнік Яўген БРАЦКОЎ.**

***— Яўген Генадзевіч, як у ваенным камісарыяце адрэагавалі на распаўсюджванне фэйкавых павестак сярод жыхароў Кастрычніцкага раёна сталіцы?***

— Прыемна, што большасць ваеннаабавязанага насельніцтва раёна — свядомыя грамадзяне. Адзін з іх знайшоў у сваёй паштовай скрыні так званую павестку. Мужчына працуе ў сур'ёзнай арганізацыі, дзе ёсць людзі, якія займаюцца ваенна-ўліковай работай і ў межах надзеленых паўнамоцтваў узаемадзейнічаюць з ваенкаматам. Туды ваеннаабавязаны і звярнуўся з гэтай «павесткай». У першую чаргу ён сам западозрыў, што яна аформлена неналежным чынам: адсутнічалі пэўныя рэквізіты, нумарацыя павесткі. Гэтую інфармацыю пацвердзілі па месцы работы і паведамілі аб інцыдэнце ў ваенны камісарыят. Мы адразу вызначылі, што павестка фэйкавая. Калі нават выказаць здагадку, што нехта пажартаваў, то жарт аказаўся зусім няўдалым. Калі ж гэта зроблена з пэўным намерам, у любым выпадку «аўтар» панясе адказнасць у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам. Павестка — юрыдычны дакумент за подпісам кіраўніка мясцовага органа ваеннага кіравання, за падробку якога прадугледжана адказнасць.

***— Каб папярэдзіць падобныя сітуацыі ў будучыні, як павінен быць аформлены сапраўдны дакумент, які паведамляе аб неабходнасці прыбыцця ў ваенкамат?***

— Ёсць устаноўленая форма павесткі, і яна вызначана для адпаведных мерапрыемстваў: або для выкліку грамадзяніна на мерапрыемства па зверцы ўліковых даных, або для медыцынскага перагляду, або на пэўныя праверачныя мерапрыемствы. Атрымаўшы павестку, грамадзянін павінен пераканацца,



што яго прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, месца выкліку (у дадзеным выпадку ваенны камісарыят) указаны правільна. У ваеннай павестцы павінна быць адзначана мэта выкліку грамадзяніна і адпаведныя рэквізіты ваеннага камісарыята: можа ўказвацца кабінет, куды выклікаецца грамадзянін. Абавязкова на павестцы павінен прысутнічаць подпіс службовай асобы (ваеннага камісара), завераны гербавай пячаткай. У выпадку баявой мабілізацыйнай гатоўнасці павестка — так званая баявая — не падпісваецца, але гербавая пячатка прысутнічае. Акрамя таго, на дакуменце, па якім грамадзянін выклікаецца ў ваенкамат, заўсёды ўказаны нумар тэлефона: па ім можна ўдакладніць, ці сапраўды чалавека кудысьці запрашаюць і з якой мэтай.

***— Найбольшую колькасць адтэрміновак ад воінскай службы апошнім часам атрымлівалі маладыя людзі, якія вучацца...***

— Па-ранейшаму большасць адтэрміновак выдаецца для працягу адукацыі. У адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, прызыўнікі маюць права на адтэрміноўку і ў сувязі са складанымі сямейнымі абставінамі, пэўнымі супрацьпаказаннямі па здароўі.

***— Другі год запар студэнтам першых курсаў ВНУ сельскагаспадарчага профілю даецца магчымасць выканаць свой воінскі абавязак падчас сваіх летніх канікулаў на працягу трох гадоў. Яшчэ падчас навучання маладыя людзі могуць закрыць сваё пытанне з арміяй. Ці шмат жадаючых скарыстацца такім правам?***

— Прайсці службу ў рэзерве маюць права і аграрыі, якія ўжо маюць дыплом аб адукацыі. Забеспячэнне насельніцтва харчаваннем з'яўляецца адным з кірункаў нацыянальнай бяспекі. Перад намі стаіць задача — прадугледзець выкананне гэтымі грамадзянамі заканадаўства (яны праходзяць службу) і разам з тым не адрываць іх на працяглы час ад сваіх прафесійных абавязкаў. Для горада Мінска гэта актуальна толькі ў тым выпадку, калі грамадзянін для выканання пэўных функцый адкамандзіраваны ў пэўную сельскую гаспадарку, агракомплекс. Што датычыцца студэнтаў-аграрыяў, то жадаючыя ёсць. Хачу адзначыць высокі маральны стрыжань, што прысутнічае ў хлопцаў, якія працуюць у аграпрамысловым комплексе. Барацьба — за кожны каласок, за кожны кілаграм ураджаю — у іх у крыві. Таму аграрыі заўсёды адэкватна ўспрымаюць інфармацыю аб мерапрыемствах прызыву і з годнасцю праходзяць службу ў шматлікіх воінскіх часцях Узброеных Сіл, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў.

***— Сярод навацый апошніх прызыўных кампаній — і тое, што маладым людзям далі магчымасць адразу праходзіць службу па кантракце...***

— Перш за ўсё, гэта выбар грамадзяніна. У адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, грамадзяне прызыўнога ўзросту могуць паступаць на ваенную службу па кантракце не толькі ва Узброеныя Сілы, а і ў іншыя войскі і воінскія фарміраванні — як правіла, у органы ўнутраных спраў і падраздзяленні Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Аднак акцэнтую ўвагу, што тэрмін кантракта павінен быць не меншы чым два гады. Калі грамадзянін звольніцца з войска хоць бы на дзень раней, ён усё роўна будзе праходзіць тэрміновую службу або службу ў рэзерве. У нас такія выпадкі таксама былі.

***— Існуе яшчэ адзін від воінскай службы, пра які апошнім часам многія забыліся, — альтэрнатыўная. Ці запатрабаваная яна сярод прызыўнікоў?***

— У гэтым прызыўным перыядзе ў нас такіх кандыдатаў няма. Што датычыцца Мінска ў цэлым, жадаючых праходзіць альтэрнатыўную службу ёсць. Не прымяншаючы вартасці гэтага віду службы, усё-ткі маладыя людзі прыйшлі да таго, што больш ганарова праходзіць службу са зброяй у руках. Хоць ёсць тыя, хто з пэўных рэлігійных перакананняў, суб'ектыўных меркаванняў не гатовыя трымаць зброю. Шляхам праходжання альтэрнатыўнай службы заканадаўства дае іншую магчымасць выканаць воінскі абавязак. Як правіла, дадзеная катэгорыя грамадзян накіроўваецца ў пэўныя ўстановы, дзе на юнакоў ускладзены канкрэтныя абавязацельствы.

***— Ці фіксуюцца выпадкі нез'яўлення грамадзян у ваенкамат?***

— У асноўным яны ўзнікаюць з аб'ектыўных прычын. Як прыклад, грамадзянін выехаў на навучанне за межы краіны і своечасова не паведаміў аб гэтым у ваенкамат. Іх мы спрабуем знайсці праз бацькоў. Калі не атрымліваецца, падключаем да вышуку кампетэнтныя органы.

***— Многія аргументуюць сваю няяўку тым, што не атрымлівалі павестку...***

— Аб мерапрыемствах прызыву грамадзянін Беларусі павінен быць абвешчаны належным чынам. Павестка ўручаецца грамадзяніну пад подпіс або пры дапамозе паштовай сувязі, што таксама з'яўляецца адной з формаў належнага апавяшчэння грамадзяніна аб выкліку на мерапрыемствы прызыву.

***— За ўхіленне ад службы прадугледжана крымінальная адказнасць...***

— Яна наступае, калі грамадзянін быў абвешчаны належным чынам — атрымаў павестку пад подпіс або накіраванне на праходжанне медыцынскага агляду ў межах мерапрыемстваў прызыву, і непасрэдным чынам ухіляецца ад іх. Па заканчэнні мерапрыемстваў прызыву мы абагульняем звесткі па дадзенай катэгорыі і ва ўстаноўленыя заканадаўствам тэрміны накіроўваем матэрыялы ў адпаведныя органы, якія праводзяць комплекс мерапрыемстваў па вызначэнні ступені віны грамадзяніна і прыцягненні яго да адказнасці.

***— Магчыма, зыходзячы з абстаноўкі, прызыўнікі сталі часцей пазбягаць ваенкамата?***

— З прычыны пэўных падзей, якія цяпер адбываюцца на еўрапейскім кантыненце, бацькі занепакоеныя, ці будуць іх сыны, накіраваныя ў далейшым для праходжання тэрміновай воінскай службы і службы ў рэзерве, адпраўлены кудысьці яшчэ. Мы пастаянна на сувязі з бацькамі, аднак больш грунтоўна і канкрэтна, чым адказалі на гэтае пытанне Прэзідэнт Беларусі і міністр абароны, ужо растлумачыць не можам: Рэспубліка Беларусь, у прыватнасці, Узброеныя Сілы, іншыя войскі і воінскія фарміраванні не бяруць ніякага ўдзелу ў спецыяльнай аперацыі, якую праводзяць Узброеныя Сілы Расійскай Федэрацыі.

***— Як маладыя людзі настроены на службу?***

— Прызыўнікі адэкватна ўспрымаюць інфармацыю, некаторым з іх уласцівы юнацкі запал. Сустракаючы гэтых маладых людзей пасля таго, як яны адслужылі і ўжо становяцца на воінскі ўлік, заўважаю, што гэта абсалютна іншыя людзі. Не тыя хлопчыкі, якіх мы адпраўлялі ў армію, а ўжо сфарміраваныя асобы. Многія бацькі выказваюць словы падзякі проста за элементарныя рэчы: да арміі іх сыны не ўмелі запраўляць ложак, не ведалі, як трымаць у руках іголку з ніткай. Пасля службы ўсё мяняецца. Прыемна бачыць маладога чалавека, які з кветкамі ідзе да маці. Словы падзякі дарагога вартыя, калі бацька кажа, што дахаты вярнуўся не проста сын, а ўжо мужчына. Правільна было некалі сказана адным з вялікіх, што ўсё-такі армія робіць з хлопчыка мужчыну. Армія — той інстытут, тая школа жыцця, якая надае агранку гэтаму алмазу пад назвай «юнак».

***— А што асабіста вас падштурхнула абраць шлях афіцэра?***

— Ва ўзросце 15-16 гадоў я быў натхнёны подзвігамі майго дзеда-ардэнаносца Георгія Міхайлавіча Брацкова, які прайшоў дарогамі Вялікай Айчыннай вайны з першага да апошняга дня. Праўда, распісацца на рэйхстагу ў яго, лётчыка, стралка-радыста, не было магчымасці. Тое выхаванне, якое было закладзена маімі бацькамі, школай, адыграла немалую ролю падчас выбару прафесіі. Працягваючы службу ва Узброеных Сілах на розных пасадах, прыйшло ўсведамленне, што мужчына — гэта не толькі воін, гэта — абаронца Радзімы. Прычым Радзіма — паняцце шырокае: гэта і сям'я, і той кавалак зямлі, дзе жывуць твае бацькі і жывеш ты сам, тое галоўнае, што ўтрымліваецца ў тваёй душы.

Увага, конкурс!

### «Звязда» аб'яўляе творчы фотаконкурс пад назвай «Гонар — служыць»

**Дасылайце свае фотаздымкі, зробленыя падчас службы ў арміі, і раскажыце на старонках найстарэйшага рэспубліканскага выдання краіны пра гэты важны перыяд у вашым жыцці. Не трэба пісаць мемуары. Дастаткова згадаць цікавую гісторыю, якая адбылася з вамі ў войску. Можна прывесці некаторыя дэталі вашай службы, расказваць пра армейскіх таварышаў.**

Удзельнікамі фотаконкурсу могуць стаць не толькі тыя, хто ў свой час выканаў воінскі абавязак, але і іх родныя, блізкія, сябры. Цікава было б пачытаць успаміны маці пра свайго сына-вайскоўца. Ці жонкі, якая раскажа аб армейскім жыцці свайго сужэнца. Не застануцца без увагі і аповеды нашчадкаў тых, хто ў свой час служыў, у тым ліку на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

Вынікі фотаконкурсу будуць падведзены напярэдадні 23 лютага, калі ў краіне адзначаецца Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Пераможцу чакае прыз.

**Фотаздымкі з кароткімі аповедамі прымаюцца на адрас: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013. Таксама іх можна даслаць у рэдакцыю па электроннай пошце — info@zviazda.by (з пазнакай «Конкурс. Плацдарм»).**

Асабістае

## «КАБ БАЦЬКА МНОЙ ГАНАРЫЎСЯ»

**Кірыл Чыжык — адзін з тых, хто нядаўна атрымаў павестку ў ваенкамат. Праўда, не «ліпавую», а сапраўдную. Малады чалавек заканчвае Беларускі дзяржаўны каледж прамысловасці і будаўнічых матэрыялаў. Навіна аб тым, што неўзабаве трэба збірацца ў армію, для яго была прадказальнай.**

— Я заўсёды хацеў служыць у войску, — расказвае малады чалавек. — Тэрміновую воінскую службу ў свой час прайшлі і мой бацька, і дзед. Чым я горшы?!

Па медыцынскіх паказаннях абмежаванняў у Кірыла няма — гэта значыць, служыць ён можа ў любым родзе войскаў. Юнак доўга не думаў: выказаў жаданне праходзіць службу або ў сілах спецыяльных аперацый, або ў паветрана-дэсантных войсках. Канкрэтнае месца выканання воінскага абавязку будзе вызначана пасля сумоўя з прадстаўнікамі элітных падраздзяленняў Узброеных Сіл.

Дарэчы, каб там служыць, мала быць абсалютна здаровым чалавекам. Неабходна яшчэ прайсці псіхалагічнае тэсціраванне, а таксама прадэманстраваць добрую фізічную падрыхтоўку. І з адным, і з другім у Кірыла Чыжыка поўны парадак. Усё сваё свядомае жыццё ён займаецца спортам: гімнастыкай, лыжамі. Ніколі не скардзіўся і на псіхічнае здароўе.

— Я іду служыць, каб бацька мной ганарыўся, — кажа малады чалавек. — Гэта важны крок для кожнага мужчыны. Нават няёмка глядзець, як некаторыя бегаюць ад арміі, ухіляюцца ад выканання воінскага абавязку.

У гэтыя дні хлопец не толькі здае выпускныя экзамены ў каледжы, а і паЧынае рыхтавацца да адпраўкі ў армію. Спрабуе арганізаваць падобны рэжым, які яго чакае найбліжэйшыя паўтара года, пытаецца пра побытавыя рэчы ў сяброў, якія ўжо адслужылі ў войску. Перажывае толькі з-за таго, што абстаноўка рэзка памяняецца. Аднак, як пераканаены юнак, да ўсяго прызвычайваешся.

Весткі з войскаў

# У ЗВЫЧАЙНЫМ РЭЖЫМЕ

## Карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў вайсковай часці і паглядзелі, як нясуць службу будучыя артылерысты

**На днях адно з найстарэйшых воінскіх злучэнняў краіны — 120-я асобная гвардзейская механізаваная брыгада — адзначыла 80-гадовы юбілей. Працягваючы традыцыі сваіх папярэднікаў, вайскоўцы 120-й з годнасцю нясуць службу па абароне Айчыны: авалодваюць сучаснымі ўзорамі ўзбраення і тэхнікі, на высокім узроўні дэманструюць прафесійнае майстэрства падчас мерапрыемстваў баявой падрыхтоўкі і буйных вучэнняў.**



Гвардыі падпалкоўнік Антон ЧАРАМНЫХ.

У няпростых умовах бягучай ваенна-палітычнай абстаноўкі ваеннаслужачыя брыгады выконваюць задачы і па ўзмацненні аховы ўчасткаў Дзяржаўнай граніцы краіны. Аднак гэта абсалютна не значыць, што тэрыторыя вайсковай часці апусцела. Злучэнне функцыянуе ў звычайным рэжыме, выконвае свае штодзённыя задачы. У гэтым пераканаліся і карэспандэнты «Звязды», якія нядаўна наведалі знакамітую воінскую часць.

### Ідуць служыць па кантракце

У склад 120-й механізаванай брыгады ўваходзіць 310-я група артылерыі. Гэта абсалютна самастойнае воінскае падраздзяленне: са сваім штабам, паркам баявой тэхнікі, ваеннаслужачымі тэрміновай службы, якія тут атрымліваюць ваенна-ўліковую спецыяльнасць «артылерыст».



— Служыць да нас ідуць з ахвотай, — паведаміў **намеснік камандзіра 310-й групы артылерыі па ідэалагічнай рабоце гвардыі падпалкоўнік Антон ЧАРАМНЫХ.** — Аднак аднаго жадання мала. Каб быць артылерыстам, неабходны матэматычны склад розуму. Невыпадкова да нас трапляюць маладыя людзі з сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыяй. Шмат жадаючых служыць па кантракце. Прычым многія прызыўнікі выкарыстоўваюць сваё права адразу замест тэрміновай праходзіць кантрактную службу. І іх абсалютна не палохае, што служыць яны будуць не год-паўтара, як звычайна, а мінімум — два.

Перавага кантрактнай службы ў тым, што ваеннаслужачы атрымлівае паўнавартасны заробак, пакідае тэрыторыю воінскай часці пасля выканання прафесійных абавязкаў. Зразумела, пэўныя абмежаванні таксама ёсць, але іх не столькі, колькі ў ваеннаслужачых тэрміновай службы. У любым выпадку, у кожнага грамадзяніна ёсць права выбару.

### Зваротная сувязь з бацькамі

Сёння вайскоўцы групы артылерыі нясуць службу ў звычайным рэжыме. Яны выконваюць свае службовыя задачы ў адпаведнасці з раскладам заняткаў. Чатыры дні на тыдзень у іх вучэбныя дні. Асаблівая ўвага ў воінскім падраздзяленні ўдзяляецца агульнавайсковай падрыхтоўцы. Па пятніцах, як правіла, у ваеннаслужачых паркавы дзень — займаюцца абслугоўваннем узбраення і ваеннай тэхнікі, чысцяць зброю. Па суботах звычайна наводзіцца парадак як у размяшчэнні, так і на тэрыторыі падраздзялення. У нядзелю ў артылерыстаў — выхадны дзень. Для іх арганізоўваюцца спартыўна-масавыя мерапрыемствы, культурныя праграмы: экскурсіі, канцэрты, кінапрагляды. Па жаданні вайскоўцы могуць пайсці ў дзённае звальненне. Многія сустракаюцца са сваякамі і сябрамі тут жа, на тэрыторыі злучэння.

Як расказаў Антон Чарамных, нягледзячы на ваенна-палітычную абстаноўку ў суседняй дзяржаве, а таксама фэйкі, звязаныя з падзеямі ва Украіне, сітуацыя ў воінскім злучэнні спакойная. «Асаблівай трывогі з боку бацькоў ваеннаслужачых не заўважаецца, — адзначыў прадстаўнік вайсковай часці. — Як і раней, яны маюць магчымасць прыехаць да нас і ўбачыцца са сваімі сынамі. Акрамя таго, кожны дзень яны трымаюць сувязь па тэлефоне. Часта мы нават нагадваем салдатам, каб патэлефанавалі дахаты. Я асабіста прашу патэлефанаваць у першую чаргу мамам, каб яны не хваляваліся».

Знаходзяцца бацькі на сувязі і з камандзірамі падраздзяленняў, дзе служаць іх сыны. У сацыяльнай сетцы створана спецыяльная суполка, у якой яны абмяркоўваюць канкрэтныя сітуацыі, непасрэдна могуць задаць пытанне прадстаўнікам воінскай часці. «Гэта значна аблягчае работу з бацькамі, — адзначае Антон Чарамных. — Усё, што звязана з іх дзецьмі, можна вырашыць непасрэдна, а не шукаць спосаб, як выйсці на камандзіра падраздзялення. Дзякуючы такой зваротнай сувязі бацькі сталі менш тэлефанаваць на «гарачыя лініі».

### Пакаленне, вартае папярэднікаў

Спакойны мікраклімат і ў калектыве ваеннаслужачых тэрміновай службы. «Я не сказаў бы, што міжнародная абстаноўка пэўным чынам на іх адбіваецца, — заўважае намеснік камандзіра па ідэалагічнай рабоце. — Магчыма, унутры яны перажываюць, але ва ўсякім разе не паказваюць гэтага. Такіх ваеннаслужачых, якія б панікавалі, дакладна няма. У гэтым кірунку пастаянна працуюць афіцэры: кожны на сваім узроўні расказвае аб ваенна-палітычнай абстаноўцы, тлумачыць дэталі».

Уладзіслаў Сямёнаў служыць у 120-й брыгадзе з лістапада 2020 года. Неўзабаве — доўгачаканы дэмбель. Юнак прызнаецца, што служба прайшла хутка. Цяжэй за ўсё, па яго словах, было ў першы перыяд, калі знаходзіўся ў «вучэбцы» ў Печах.

Малады чалавек — мінчанін. Але нягледзячы на тое, што служыць зусім побач з домам, там за



перыяд службы ён быў усяго некалькі разоў. Дысцыпліну, як той казаў, нікто не адмяняў.

— Армія навучыла мяне быць больш адказным, смелым, упэўненым у сабе, — лічыць салдат тэрміновай службы. — Цяжкасці, праз якія тут праходзіш, толькі загартоўваюць. Вядома, складаней за ўсё было прыстасавацца да распарадку дня. Падтрымлівалі бацькі, сябры, якія прыязджалі па нядзелях. Хоць без гэтага, на мой погляд, можна абысціся. Апошнім часам я кажу бацькам, каб не ехалі: яны хочуць парадаваць мяне нечым смачненькім, а ў часці нас і так вельмі добра кормяць.

Ваеннаслужачы Віталь Смаляк успрымае службу ў арміі як яшчэ адзін жыццёвы ўрок, праз які павінен прайсці кожны мужчына. «Пайсці ў армію патрэбна як мінімум для таго, каб даведацца, хто ты на самай справе і на што здольны, — гаворыць малады чалавек. — Нават калі ў будучыні табе не спатрэбіцца тая ваенна-ўліковая спецыяльнасць, якую ты атрымаў у войску, гэты вопыт будзе вельмі карысны ў розных жыццёвых сітуацыях».

Віталь ганарыцца, што служыць ва Узброеных Сілах. Асабліва для яго гэта важна з той прычыны, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў шэрагах абаронцаў Радзімы быў яго родны дзед — таксама артылерыст. Малады чалавек сціпла расказвае, што яго дзед, удзельнік баявых дзеянняў, узнагароджаны медалём.

Ды якім! Медаль «За адвагу» сярод радавога складу лічыўся найбольш ганаровай узнагародай.

**«Усё, што звязана з іх дзецьмі, бацькі могуць вырашыць непасрэдна з камандзірам падраздзялення. Дзякуючы такой зваротнай сувязі бацькі сталі менш тэлефанаваць на «гарачыя лініі».**

Дзядуля вайскоўца тэрміновай службы, Уладзімір Архіпавіч Смаляк, як і многія прадстаўнікі таго пакалення пераможцаў, не любіў расказваць пра вайну. Тым больш, ён ніколі не хваліўся сваімі подзвігамі. Добра, што дакументы, якія захоўваюцца ў Цэнтральным архіве Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, дазваляюць узнавіць рэальныя падзеі. «7 жніўня 1944 года ў раёне вёскі Апенышы, ноччу, яфрэйтар Смаляк суправаджаў аўтамашыну з боепрыпасамі, — апісваецца ў дакументах подзвіг Уладзіміра Смаляка. — Ад скінутай самалётам праціўніка бомбы на аўтамашыне ўзнік пажар. Яфрэйтар Смаляк, ігнаруючы небяспеку, спыніў аўтамашыну і ліквідаваў пажар, які ўзнік. Яфрэйтар Смаляк з прычыны неўкамплектаванасці асабовым складам узвода боехарчавання, не лічачыся са стомленасцю, самаахвярна працуе па падвозе боепрыпасаў у любых умовах баявой абстаноўкі».

Яшчэ раз удалося пераканацца ў тым, што сярод маладога пакалення абаронцаў Айчыны нямала тых, хто ведае сваю гісторыю, а таму свята шануе традыцыі сваіх продкаў, закладзеныя ў мінулым стагоддзі.



**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

**Матэрыялы выпуску падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.**

ЗАМЕСТ ЭПІГРАФА:

*...«Звязду» выпісваю заўсёды,*
*Прывык з паштовай скрынкі браць.*
*Яна — штодзённаю нагодай*
*На роднай мове пачытаць*
*Аб тым, што дзеецца на свеце...*
*Перажываю — з-за ўсяго...*
*Ці не загіне ў газеце*
*Любімы конкурс «Хто каго?»*

**Іван Астроўскі, г. Мінск.**

# «ЯШЧЭ ПАРУ ГОД НАЗАД БЫЎ У МАР'І ЗААСАД...»

**...Людзі праўду кажуць: адзін крок, не больш, ад любові да — мякка кажучы — яе адсутнасці, ад здароўя да хваробы, ад жыцця...**

**Не будзем працягваць (ва ўсякім разе, тут і цяпер). У адваротным напрамку «шлях» таксама пракладваць не будзем, бо яго, здараецца, проста няма. Заўважым хіба, як шмат апошнім часам змянілася, прычым настолькі, што новы агляд лістоў можна пачаць... з канца.**

**Такім чынам на пазамінулым конкурсным здымку (гл. «Звязда» 25.01. 22 г.) быў агромісты кузаў новага МАЗа, побач з ім — хай невялікі, але ж натоўп (магчыма, турыстаў), аднаго з якіх загнала ўверх — на кола машыны.**

Які нячысцік тое зрабіў і з якою мэтай, — здагадак (яны ж — подпісы да здымка) было ў пошце нямала. Што, можа, цікава, асобных з аўтараў ці не зрок падвёў: «слана» (то-бок верхалаза) на пазамінулым, здымку яны не заўважылі. Не зразумелі, на жаль, і хто на мінулым. Добра, што **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў** размову дзяцей падслухаў:

*Таня кажа: «Тут авечка...*
*Дзед іх пасвіў каля рэчкі».*
*— Не і не! — прызнаў*
*Сярога. —*
*Тут казёл — глядзі на рогі!*
*— Барады няма... Баран. —*
*Думку выказаў Раман.*
*Хай «Звязда» рассудзіць*
*спрэчку:*
*Тут баран? Казёл? Авечка?*

Усё заблытана, але...

«Новы конкурсны здымак, — піша **спадарыня Валянціна Гудачкова з Жыткавіч,** — мы разглядалі разам з сяброўкай, і яна ўспомніла, што некалі ў модзе былі вучэбна-вытворчыя камбінаты, што яны давалі дзецям азы нескладаных прафесій... Адна дзяўчынка, напрыклад, вучылася там на даярку... Разоў колькі ўжо на занятк з'ездзіла — малодшы брат і цікавіцца: «Ну як? Ты пазнаёмілася з каровай?». Тое ж самае мы ўбачылі на здымку:

*На падворак госцік ломіцца*
*Ў кучаравенькім манто.*
*Рожкі — супер!*
*— Пазнаёмімся?*
*Я — Маруся, а ты — хто?»*

Гэта — пакуль — загадка, бо (з тога ж канверта):

*Свет жывёл такі*
*стракаты...*
*Шмат мы ведаем рагатых:*
*Навіна ў грамадзе:*
*Бараном — казёл ідзе.*
*Клікаць як? Ды невядома:*
*Не паказваў ён дыплома.*

Хоць, напэўна ж, мог, бо (на твары напісана — **спадар Сабалеўскі з Узды** прачытаў):

*Ён з дыпломам,*
*ён з мандатам,*
*Непрыступны і сярдзіты,*
*Сам рагаты, барадаты —*
*Нібы з золата адліты.*
*Як васпана даглядаюць*
*(Нагуляў на пядзю здор)...*
*За ўсё гэта — не пушчае*
*П'янчукоў да бабы ў двор.*

Трэба разумець, ахоўнікам працуе (ці падпрацоўвае?). І ў багатай, працавітай жанчыны, думкі якой прачытала **спадарыня Аляхновіч са Слуцка:**

*«Як жа добра, што вясна! —*
*Цешыцца Адарка. —*
*Не глядзіце, што адна, —*
*Маю гаспадарку:*
*Куры, гусі, важны кот*
*І каза Маруся...*
*Нехта ломіцца ў плот?*
*Хто, — не разбяруся?*

І гэта — заўважце — пра Адарку, вяскоўку, гаспадыню... Што тады пра іншых казаць?

Чыстую праўду (з падачы **спадарыні Гудачковай**):

*Йшла кабета*
*звычным шляхам.*
*Раптам...*
*Хто ж?*
*Страшны такі!*
*Ёй з такога пераляку*
*Не адкінуць бы канькі!*

З правілаў жыцця: цалуй — павольна, уцякай і прабачай — хутка, рондаль ад грэчкі мый адразу... І анекдот: жыццё чалавека дзеліцца на перыяды. У першым ён баіцца монстра, што жыве пад ложкам, потым — не, нават ніколечкі: няхай жыве, нават *на* (?!) ложку, абы за «камуналку» плаціў...

У запісе **спадара Сабалеўскага** — маналог (трэба разумець, адной з плацельшчыц):

*...Што каханне —*
*штука злая,*
*Вечна кажуць у народзе.*
*Напаткала вось казла я*
*(Бач, былі барodкі*
*ў модзе)...*
*Колькі год ужо цалую*
*Не найлепшую з істот.*
*Ды змірылася, цярплю я,*
*Бо не выганіш за плот...*

Іншымі словамі, усё паводле анекдота: ён есць — я гатую, ён носіць — я мыю, ён раскідвае — я збіраю... І што б я без яго рабіла?

Малюнак з натуры ад **спадара Мікалая Камароўскага з Оршы...**

Зрэшты, не: спачатку — пытанне на засыпку:

*Не было раней такога:*
*Вёска —*
*вымерла ці спіць?..*
*Застаецца хоць з казою*
*Цераз плот пагаманіць.*

Пра што? Ну, вядома ж — пра жыццё-быццё, пра жаночае, набалелае:

*— Як жывеш, суседка Аза?*
*— Ды пра што тут*
*гаварыць?*
*— Мой казліна спіць,*
*зараза...*
*— Мой гультай таксама*
*спіць.*

Карацей — абое рабое, як той казаў. І можа, за шчасце яшчэ, што спяць дома (праверана: калі мужчына перастае штодзень галіцца, мяняць шкарпэткі, прасіць прабачэння, казаць кампліменты і дарыць кветкі, — супакойся, ён твой).

Не ўсім на гэта пашчасціць...

З таго самага канверта, ад **спадара Камароўскага,** дыялог мо тых самых «суседак»:

*— Што ў сяле чуваць*
*з навінаў?*
*Калі ласка, раскажы.*
*— Не паверыш,*
*мой казліна,*
*Да другой пайшоў казы.*
*— Мой*
*не лепшая скаціна —*
*Хоць стары —*
*у распусту зноў:*
*Прыжаніўся, кабяліна!*
*Маладзейшую знайшоў!*

(З дыялогаў мужчын: «У выхадныя з'ездзіў з дачкой у вёску, паказаў дзіцяці казла». — «А гэта навошта?» — «Ды каб ведала, як выглядае, а то ўсё са слоў маці...»

З дыялогаў жанчын: «Да вяселля мой муж быў самым цудоўным хлопцам на свеце!» — «І не кажы! Майго таксама ў загсе падмянілі!»

...Зрэшты, вернемся да нашых бараноў... Казлоў... Ці ўсё ж такі авечак?

Вось якраз да іх і сапраўды трэ было б (прычым — не толькі на паперы), бо авечкі, на думку **спадарыні Любові Чыгрынавай** з Мінска, відаць, найлепшая скацінка: спакойныя, чыстыя, непатрабавальныя. І пры гэтым на многае здольныя. Ва ўсякім разе, яны могуць і адзяваць нас (у натуральнае, цёплае), і абуваць — у такое ж, і кармiць, і нават лячыць... Таму цалкам лагічна, што

*Заказаў адзін сусед*
*Барана праз інтэрнэт,*
*Каб здаваць таго*
*ў «арэнду»,*
*Каб зажыць пасля*
*на рэнту...*
*Але ж марам яго «швах»:*
*Бізнес лопнуў на вачах.*
*Не датумкаў чалавеча,*
*Што ніводнай тут*
*авечкі...*

Пра тую ж бяду і радкі ад **спадара Валерыя Гаўрыша:**

*Ў цёткі Насты ёсць баран*
*Па мянушцы Атаман.*
*Пахаваўшы свайго дзеда,*
*Наста з ім вядзе «бяседы»:*
*Ён і чуе, й разумее...*
*Ды сказаць хіба не ўмее:*
*Без атары? Атаман?*
*Не жыццё —*
*адзін падман.*

Але ж ён, паводле **спадарыні Соф'і Атрохавай са Случчыны,** можа скончыцца — па-першае — дабром, па-другое — хутка:

*Як заўсёды, рана ранкам*
*Аглядае жыўнасць Ганка.*
*Сёння ж — мае навіну,*
*Можа, нават не адну,*
*Бо з суседняга падворка*
*Удавец зайшоў, Ягорка.*
*Мовіў:*
*«Досыць нам тужыць,*
*Можа,*
*разам будзем жыць?*
*Удваіх, па-чалавечы...»*
*Прывядзе ён і авечак.*

Даўно б так! Глядзіш — не ўзнікла б падстаў для сумнага (ад **спадара Сабалеўскага**):

*На ўсю вёску засталіся*
*Толькі мы з табой,*
*сяброўка.*
*А былі ж, былі калісьці*
*Школа, ферма*
*і сталоўка...*

Цяпер — трэба разумець — няма? І, на думку **спадарыні Чыгрынавай,** не толькі іх:

*Яшчэ пару год назад*
*Быў у Мар'і заасад (!),*
*Паглядзець таго звяр'я*
*Людзі ехалі здаля.*
*Забяспечвалі прыбытак,*
*Пагашаліся крэдыты...*
*Ад кавіду ўсё гора:*
*У «заасадзе» толькі Бора.*

Трэба разумець — баран ці...

*Козліка бабця вельмі любіла,*
*Козліка бражкаю*
*часта паіла...*
*Вырас казёл...*
*З казою здружыўся:*
*Хутка мутант*
*у яе нарадзіўся.*
*Да бабкі прыйшоў*
*і глядзіць-дакарае:*
*Ну што ж ты зрабіла,*
*дурніца старая?*
*...Падобнае нешта*
*здараецца й з намі,*
*Як добрую справу*
*ды зробім «па п'яні».*

Да такой несуцяшальнай высновы прыйшоў **спадар Мікалай Старых** з Гомеля.

Ненашмат весялейшыя назіранні і ў **спадарыні Таццяны Новік** з Клецка. «Подпісы да апошняга здымка склаліся ў мяне адразу, але ж запісала іх ды забылася, — прызнаецца жанчына. — А потым падумала: мо і праўда ў газету пасла**ць**? Спатрэбяцца дык спатрэбяцца, а не — дык не крыўдую: я для звілін размінку зрабіла, радню пасмяшыла і досыць».

Не варта спыняцца на дасягнутым: дзяліцца трэба — дэфіцытнымі па сённяшнім часе думкамі, усмешкамі, успамінамі. Ну згадзіцеся (са **спадарыняй Новік**):

*У часы перабудовы*
*У людзей былі каровы:*
*Мяса, масла, сырадой —*
*Малако ішло ракой...*
*Ды цяпер няма і блізка,*
*Доім — хіба Васілiску.*
*Малака дае нямнога,*
*Але ж цётцы ўсё падмога.*

З тога ж канверта, ад **спадарыні Новік:**

*Шчасце — козачку даіць!*
*Шчасце — з ёй пагаманіць:*
*Пра бяду,*
*як ёсць, раскажаш, —*
*Ад душы,*
*лядзіш, адляжа...*



*Вельмі слаўная каза:*
*Супраць? Не!*
*Заўсёды «за».*

А значыць, трэба іх разводзіць, трэба шкадаваць ці не ўсіх, хто ніколі не меў такіх кармільцаў і суразмоўцаў. **Спадар Іван Астроўскі** з Мінска, напрыклад, вельмі шкадуе:

*Калі б мне, малому,*
*«звер» такі папаўся,*
*Я б на ім, браточкі,*
*добра пакатаўся!*
*Выбіраў бы з дужых —*
*век такія біліся,*
*І гайсаў бы верхам —*
*покуль не скарыліся...*
*Малому —*
*незнаёмы страх,*
*Але ж не ездзіў на казлах:*
*Тады быў іншы трохі час:*
*Коз —*
*не трымаў ніхто ў нас.*

Казлоў, вядомых сваёй ваяўнічасцю ды ўпартасцю, — атрымліваецца — таксама?

(З назіранняў: на вуліцы ледзь не бойка ідзе. Толькі і чуваць: «Ты казёл!» — «Ад казла тое чую!»... Нейкі дзед, праходзячы міма: «Хлопцы, вы ж, відаць, радня, сваякі? Дык навошта вам гэтая грызня?!»

З заўваг (ці не ад такога ж мудрага дзеда): усе разумныя дружаць між сабой, усе дурныя сварацца).

І нарэшце — завяршальныя акорды ад **спадара Мікалая Касмачэўскага** з Наваполацка:

*Мы ў горадзе жывём,*
*Хлеб ядзім,*
*кефірчык п'ём...*
*Да ўсяго — адна загана:*
*Блытаем казла з баранам.*

«Звязда» падраджалася разабрацца? Тады шчырыя прабачэнні ўсім баранам: як падказвае дасведчаны інтэрнэт, на здымку ўсё ж... казёл (падобна — прыдонскай пуховай пароды). Хто пра іх абодвух напісаў найлепшыя радкі, пакажа час. А пакуль — з падказкі чытачоў — найбольш удалыя радкі «пра верхалаза з БелАЗа» *(гл. нумар «Звязды» сёлета за 26 студзеня)* склалі **спадарыні Валянціна Гудачкова з Жыткавіч і Іна Алісевіч з Уздзеншчыны, спадары Мікалай Старых з Гомеля, Віктар Сабалеўскі з Узды, Валерый Гаўрыш з Чавусаў і Мікалай Касмачэўскі з Наваполацка.**

Вось з гэтым, апошнім меркаваннем вялікага чытацкага журы, пагадзілася і журы маленькае (рэдакцыйнае). А значыць, прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» на трэці квартал 2022 года накіроўваецца ў Наваполацк.

Хочацца, каб «родная газета на роднай мове» пяць разоў на тыдзень прыходзіла да вас, тады варыянтаў два: першы — афармляць падпіску, другі — уважліва паглядзець на новы конкурсны здымак, прыдумаць подпіс (можна некалькі, але трапных, дасціпных, кароткіх (пажадана не больш за восем радкоў) і даслаць у рэдакцыю.

Шанц на выйгрыш мае кожны.

**Валянціна ДОЎНАР.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

**АД ІХ ЖА:** шчырыя прабачэнні тым, чые подпісы на гэты раз не прайшлі строгага конкурснага адбору. Затое ў наступны... Пішыце і — па магчымасці — усміхайцеся. Як пісаў нехта з вялікіх, смех — гэта сонца: яно праганяе зіму з чалавечага твару.



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
30 сакавіка 2022 г. № 12 (648)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ

# З ПАШАНАЙ ДА ДАВЕРУ ЛЮДЗЕЙ



Фота БелТА.







## Адзіны дзень прыёму грамадзян, які праводзіць Савет Рэспублікі, дапамагае вырашыць праблемы ў розных кутках краіны

**ДАПАМОГУ ў вырашэнні праблемных пытанняў знайшлі жыхары з розных куткоў краіны падчас адзінага дня прыёму грамадзян членамі Савета Рэспублікі на Гомельшчыне. Фармат такой работы сенатараў у рэгіёнах застаецца адной з самай эфектыўных практык работы са зваротамі грамадзян.**

Падводзячы вынікі адзінага дня прыёму, **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА,** якая прымала людзей у Светлагорску (аб гэтым «Звязда»падрабязна пісала на мінулым тыдні), адназначна пацвердзіла: падобная практыка павінна працягвацца. «Гэта важна, каб бачыць і чуць нашых людзей, дапамагаць у вырашэнні іх праблем. Работа дае значны эфект. Таксама вельмі карысная і для нас. Многія пытанні, якія агучваюць людзі, разглядаем разам з мясцовымі органамі ўлады на пашыраным пасяджэнні прэзідыума, выкарыстоўваем у сваёй рабоце над законапраектамі», — сказала яна.

Такая работа, на думку Старшыні Савета Рэспублікі, — сур'ёзная падмога для нарматворчай дзейнасці. «У нас працуе экспертны савет, які ацэньвае прапанаваныя новаўвядзенні. Важна, каб пры прыняцці нарматыўных прававых актаў усё было дакладна выверана. Такая задача пастаўлена Прэзідэнтам. Усе рашэнні, якія прымаюцца, павінны быць актуальныя, на карысць дзяржавы і нашага народа», — растлумачыла спікер.

Падчас адзінага дня прыёму людзі ішлі да сенатараў са сваімі праблемамі, пытаннямі і заўвагамі. Карэспандэнт «МС» пацікавілася, як прадстаўнікі заканадаўчай улады працавалі на месцах.

***

**Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ** правёў асабісты прыём у Акцябрскім раёне. Сенатару адрасавалі пытанні па абскарджанні судовых рашэнняў, звальненні, долевага будаўніцтва, а таксама заканадаўчага рэгулявання кампенсацыі банкаўскіх укладаў.

Сяргей Сівец падчас прыёму па сутнасці зваротаў даў неабходныя тлумачэнні. Асобныя пытанні былі ўзятыя парламентарыем на асабісты кантроль.

Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве таксама правёў сустрэчу з актывам Акцябрскага райвыканкама, дэпутатамі, кіраўнікамі працоўных калектываў і членамі Маладзёжнага савета. Сяргей Сівец засяродзіў увагу на рабоце парламентарыяў у рамках канстытуцыйна-прававой рэформы, заканадаўчай і міжнароднай дзейнасці Савета Рэспублікі, падкрэсліў важнасць і актуальнасць работы са зваротамі грамадзян.

стар. 8

НА ПАРАДКУ ДНЯ

# Амаль 60 пагадненняў

## рыхтуецца да падпісання на IX Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі

**СТАРШЫНЯ Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з дэлегацыяй Савета Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі па падрыхтоўцы і правядзенні IX Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.**



Фота БелТА.

Паводле слоў спікера верхняй палаты беларускага парламента, пленуецца, што ў гэтым годзе форум, які традыцыйна праводзяць Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Савет Федэральнага сходу Расіі, пройдзе ў вочным фармаце ў канцы чэрвеня ў Гродне. «Нішто не перашкаджае нам яго правесці. Вызначаны дата, месца для пражывання ўдзельнікаў і правядзення секцый, іх тэматыка», — звярнула ўвагу спікер верхняй палаты.

«Акрамя таго, у нас пленуецца яшчэ адно вельмі важнае палітычнае мерапрыемства, якое, спадзяюся, ляжа на душу ўсім і стане традыцыйным, — «Цягнік Перамогі». Гэта падзея будзе інтэгравана ў Форум рэгіёнаў. Дзесяцікласнікі з дзвюх краін разам праедуць па знакавых мясцінах, дзе ішлі баі ў Вялікую Айчынную вайну, беларускіх і расійскіх гарадах. Старт гэтай акцыі будзе дадзены 22 чэрвеня — у значны для нашай краіны дзень», — дадала Наталля Качанава.

«Мы ўсе заўважаем, які беспрэцэдэнтны ціск аказваецца сёння на Беларусь і Расію. Нас гэтым не напалохаць, і пацвярджэннем таму — будучы Форум рэгіёнаў. У гэтым годзе асаблівую актуальнасць набывае развіццё нашага інтэграцыйнага супрацоўніцтва паміж рэгіёнамі дзвюх краін, перад якімі адкрываюцца вялікія магчымасці», — падкрэсліў **старшыня Камітэта Савета Федэрацыі па федэратыўным уладкаванні, рэгіянальнай палітыцы, мясцовым самакіраванні і справах Поўначы Андрэй ШАЎЧЭНКА.**

Так, у найбліжэйшыя месяцы ў Беларусь пленуецца прыезд дэлегацый шэрагу расійскіх рэгіёнаў, у тым ліку з Пензенскай і Варонежскай абласцей. «Вельмі важна да самога форуму правесці дзелавыя сустрэчы, у тым ліку прадпрымальнікаў, для якіх гэта дасць новы штуршок да развіцця», — расказаў Андрэй Шаўчэнка.

«Пленуецца вялікая колькасць удзельнікаў — каля 250 з кожнага боку. Акрамя таго, форум не закрыты для ўдзелу любога бізнесу. У нас будзе шэсць тэматычных секцый, якія цесна інтэграваны ў 28 саюзных праграм, прынятых кіраўнікамі дзяржаў. Ва ўмовах кашчунскай санкцыйнай палітыкі калектыўнага Захаду і ЗША мы можам зрабіць сур'ёзны крок у галіне імпартазамяшчэння, аб'яднаўшы намаганні. Так, будуць узнімацца пытанні, звязаныя з прамысловасцю, аграпрамысловым сектарам, развіццём сферы адукацыі, навацыямі і інвестыцыямі. На сёння ў нас у прапрацоўцы на падпісанне амаль 60 пагадненняў паміж рэгіёнамі», — дадаў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл Русы.

У гэтым годзе тэма IX Форуму рэгіёнаў — «Роля міжрэгіянальнага супрацоўніцтва ў паглыбленні інтэграцыйных працэсаў у рамках Саюзнай дзяржавы».

**Наталля КАЧАНАВА**:

# «МНОГАЕ ЎЖО ЗРОБЛЕНА, АЛЕ ЯШЧЭ БОЛЬШ ТРЭБА ЗРАБІЦЬ»

**СТАРШЫНЯ Савета Рэспублікі Наталля Качанава ўзяла ўдзел ва ўрачыстым пасяджэнні Савета Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Мерапрыемства, прысвечанае 30-годдзю арганізацыі, прайшло ў Алматы.**

«Гэта сапраўды знакавая дата ў развіцці міждзяржаўнага супрацоўніцтва і парламентарызму, — сказала Наталля Качанава. — Да гэтага часу балюча ўспамінаць, як пасля развалу Савецкага Саюза кожная краіна засталася сам-насам з сабой, а мільёны людзей, якія страцілі любімую Радзіму, былі ў стане разгубленасці і адчаю, перажываючы гэтыя падзеі як асабістую трагедыю. Як паказала жыццё, гэта была найбуйнейшая геапалітычная катастрофа XX стагоддзя. Толькі мудрае рашэнне кіраўнікоў былых саюзных рэспублік аб запуску аб'яднальных працэсаў дало нам магчымасць не адарвацца адно ад аднаго, зберагчы духоўную блізкасць і, самае галоўнае, — пакінуць шанц на будучыню».

Наталля Качанава заўважыла, што Садружнасць Незалежных Дзяржаў і яе парламенцкае вымярэнне — Міжпарламенцкая асамблея — прынялі на сябе важную цывілізацыйную місію: з'яднанне народаў постсавецкай прасторы адзінствам волі, адзінствам думкі і непахісным маральна-палітычным адзінствам. «Адчуваць адно аднаго не толькі розумам, але і сэрцам — гэта аснова нашага шматграннага доўгатэрміновага супрацоўніцтва. Як справядліва адзначыў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь: толькі аб'яднаўшы намаганні і павысіўшы ролю Садружнасці як рэгіянальнага гульца, мы зможам паспяхова процістаяць усім выклікам і пагрозам» — дадала Старшыня Савета Рэспублікі.

## Увабраць у сябе ўсё найлепшае

Наталля Качанава звярнула ўвагу, што сёння Міжпарламенцкая асамблея СНД па праве карыстаецца рэпутацыяй аўтарытэтнай міжнароднай платформы, дзе кожная краіна-ўдзельніца можа данесці сваю пазіцыю, і яе голас будзе пачуты. «Адна з ключавых задач Міжпарламенцкай асамблеі — збліжэнне прававых сістэм дзяржаў — удзельніц Садружнасці і стварэнне ўмоў для ўсебаковай інтэграцыі на аснове мадэльных заканадаўчых актаў і рэкамендацый, што прымаюцца. На гэтым этапе адносіны постсавецкіх незалежных дзяржаў патрабуюць агульных і ўзгодненых падыходаў у мэтах умацавання міжнароднай бяспекі і фарміравання прававых асноў агульнай эканамічнай прасторы СНД», — сказала яна.

Наталля Качанава прывяла канкрэтныя прыклады. На сёння прынята каля 600 мадэльных законаў і іншых актаў. Пастаянны маніторынг пацвярджае запатрабаванасць гэтых дакументаў у прававых сістэмах дзяржаў — удзельніц СНД: нормы больш як 70 працэнтаў з іх былі імплементаваны ў заканадаўства краін, а яшчэ каля 10 працэнтаў змяшчае палажэнні, якія супадаюць з нацыянальнымі законамі.

Паводле яе слоў, дзейнасць Міжпарламенцкай асамблеі не абмяжоўваецца заканатворчасцю і пратакольнымі мерапрыемствамі парламенцкіх дэлегацый. Многія ініцыятывы Асамблеі, уключаючы Пецярбургскі эканамічны форум, Неўскі міжнародны экалагічны кангрэс, форум «Дзеці Садружнасці», Еўразійскі жаночы форум, перараслі ў паўнавартасныя інтэрнацыянальныя рухі. Наталля Качанава ўпэўненая: гэта сведчыць аб тым, што патэнцыял арганізацыі ў вырашэнні глабальных праблем чалавецтва выступае сілай, якая кансалідуе і можа пераадольваць любыя існуючыя бар'еры паміж прадстаўнікамі розных рэгіёнаў і кантынентаў.

## Адкрываецца новая эпоха магчымасцяў

«Супрацоўніцтва нашых парламенцкіх дэлегацый у МПА СНД можа быць прыкладам для парламентарыяў усяго свету, як выбудоўваць культурны дыялог на прынцыпах узаемнага даверу, павагі і суверэнай роўнасці, чаго так не хапае ў сучасным свеце, які хутка змяняецца», — канстатавала Наталля Качанава.

Асабліва гэта актуальна сёння, у час, калі, па словах Наталлі Качанавай, мы, магчыма, перажываем самае сур'ёзнае спаборніцтва — за адзінства брацкіх народаў. «На жаль, цяпер спробы пасеяць варожасць і нянавісць паміж нашымі краінамі кратна ўзмацняюцца. Нас спрабуюць запалохаць, прымусіць забыць сваё мінулае, адрачыся адно ад аднаго. Адным словам, падарваць веру ў тое, што мы — народы адной геапалітычнай прасторы і агульнага лёсу», — заявіла яна.

Спікер заўважыла, што ўсіх паасобку спрабуюць вымотваць выпрабаваннямі на трываласць. Прычым далей лягчэй і прасцей не будзе. Таму ў цяперашніх рэаліях Міжпарламенцкая асамблея набывае асаблівыя ролю, статус і значэнне. «Нам ёсць за што змагацца. Многае ўжо зроблена, але яшчэ больш трэба зрабіць. Для ўсіх нас адкрываецца новая эпоха магчымасцяў. Перакананая, што мы і надалей будзем прымаць разумныя, сапраўды важныя і патрэбныя нашым народам рашэнні, а кожная краіна-ўдзельніца — самы актыўны і непасрэдны ўдзел у іх рэалізацыі на карысць агульнага развіцця і росквіту. Разам мы зробім усё магчымае, каб адрадзіць дух згоды не толькі на прасторы Садружнасці Незалежных Дзяржаў, але і ва ўсім свеце. Гэта ў нашых сілах», — канстатавала Наталля Качанава.

Яна падкрэсліла, што ўклад Міжпарламенцкай асамблеі ў развіццё інтэграцыйнага ўзаемадзеяння — гэта, несумненна, агульны здабытак суверэнных дзяржаў — удзельніц Садружнасці. Старшыня Савета Рэспублікі выказала ўпэўненасць, што юбілейнае пасяджэнне МПА СНД дасць магчымасць намеціць новыя стратэгічныя напрамкі міжпарламенцкага супрацоўніцтва, а таксама паслужыць далейшаму ўмацаванню аўтарытэту арганізацыі. «І ў завяршэнне ад імя парламенцкай дэлегацыі Рэспублікі Беларусь хачу сказаць: мы — разам. Дружба і братэрства нашых народаў вытрымаюць любыя самыя суровыя выпрабаванні», — дадала яна.

Наталля Качанава таксама абвясціла прывітанне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ўдзельнікам пасяджэння Савета Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД да 30-годдзя асамблеі ў Алматы.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# З ПАШАНАЙ ДА ДАВЕРУ ЛЮДЗЕЙ

***

— Падчас правядзення асабістых прыёмаў важна пачуць кожнага чалавека з яго праблемамі і прапановамі. Бо любы заяўнік, калі звяртаецца па дапамогу, верыць у здольнасць органаў улады паглыбіцца ў сітуацыю, прыслухацца да яго праблемы і папярэдзіць адзначаныя недахопы. Менавіта таму вельмі важна не проста шанаваць такі давер, а ўсяляк і паўсюдна ўмацоўваць яго, — важнымі прынцыпамі ў рабоце з людзьмі на ўсіх узроўнях падзяліўся **Віктар ЛІСКОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.** Ён правёў асабісты прыём у Рэчыцы.

Да ўдзелу ў прыёме сенатара далучыліся дэпутаты райсавета, адказныя супрацоўнікі райвыканкама і прадстаўнікі Рэчыцкага Маладзёжнага парламента.

Віктар Лісковіч выслухаў заяўнікаў і адказаў на хвалюючыя пытанні. Асобныя звароты, адрасаваныя сенатару падчас прыёму, датычыліся заканадаўчага ўрэгулявання на міждзяржаўным узроўні сферы пенсійнага забеспячэння, унясення змяненняў у Адзіны тарыфна-кваліфікацыйны даведнік спецыяльнасцяў.

***

Больш за 30 жыхароў Гомеля і Гомельскага раёна звярнулася па параду і дапамогу ў вырашэнні



праблемных пытанняў да **Таццяны РУНЕЦ.** Адзіны дзень прыёму грамадзян членамі Савета Рэспублікі ў Гомельскай вобласці **старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах** правяла ў Гомельскім гарвыканкаме. На прыём былі запрошаны кіраўнікі адміністрацый горада і раёна, а таксама профільныя спецыялісты.

Частка зваротаў, адрасаваных Таццяне Рунец, датычылася сітуацый па судовых рашэннях, прэтэнзій да суседзяў, нязгоды з памерам налічаных пенсій. Закраналіся і традыцыйныя тэмы, якія хвалююць жыхароў, — рамонт дарог, добраўпарадкаванне тэрыторый, рэканструкцыя жылых дамоў, выдзяленне жылля шматдзетным сем'ям, якасць аказання медыцынскай дапамогі. Акрамя таго, паступілі да грамадзян і прапановы па ўдасканаленні заканадаўства.

— Калі нават чалавек раней неаднаразова звяртаўся ў розныя ведамствы і інстанцыі, мы будзем разглядаць яго пытанне на нарадзе, збіраць рабочыя групы, камісіі, — адзначыла Таццяна Рунец. — Важна комплексна вывучыць праблему і па магчымасці вырашыць яе. Бываюць выпадкі, калі грамадзянін абышоў усе інстанцыі, і вынесена рашэнне суда — тут важна разумець, што мы не можам яго адмяніць. Але калі ёсць шанц дапамагчы чалавеку, мы ім скарыстаемся.

***

Некалькі зваротаў, якія паступілі падчас адзінага дня прыёму грамадзян членамі Савета Рэспублікі да сенатара **Алы СМАЛЯК,** было вырашана станоўча яшчэ да пачатку прыёму. Парламентарый правяла асабісты прыём грамадзян і прамую тэлефонную лінію ў Лоеўскім райвыканкаме. Жыхары рэгіёна адрасавалі пытанні захавання ўнікальнай прыроды Лоеўскага краю, аказання дапамогі бежанцам з Украіны. На прамую лінію таксама звярнуліся жыхары Хойніцкага раёна, якія падзякавалі Але Смаляк за аператыўнае вырашэнне пытання водазабеспячэння.

***

Сенатар **Аляксей НЯВЕРАЎ** разбіраўся ў сітуацыі па адным са зваротаў з выездам на месца. Так, пасля правядзення прыёму ў Рагачоўскім райвыканкаме член Савета Рэспублікі, старшыня Гомельскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў наведаў раённую спецыялізаваную дзіцяча-юнацкую школу алімпійскага рэзерву № 2 імя Гарбачова. Парламентарый азнаёміўся з работай басейна і ўмовамі, створанымі для яго наведвальнікаў.

— Некаторыя хвалюючыя для жыхароў рэгіёна пытанні ўдаецца вырашыць шляхам тлумачэння нормаў дзеючага заканадаўства, аднак частка з іх патрабуе разгляду і вырашэння ў цесным узаемадзеянні з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі ўлады, — падзяліўся досведам работы з людзьмі на месцах Аляксей Няверaў.

Усе звароты, па якіх не ўдалося знайсці рашэнне непасрэдна падчас прыёму, парламентарый узяў на асабісты кантроль.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**



*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

ВАЙНА ПАД СТРЭХАМІ

# НЯЎЛІЧАНЫЯ ЖЫЦЦІ

## Сенатар з Магілёва Алег ДЗЯЧЭНКА дапоўніў базу звестак пра ахвяр генацыду па Магілёўскім раёне

**ЛЕТАСЬ, калі ў краіне пачалася маштабная работа па даследаванні тэмы генацыду, Алег Дзячэнка не застаўся ўбаку. Прарэктар па вучэбнай рабоце МДУ імя А. Куляшова, гісторык па адукацыі, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, ён і раней назапашваў матэрыял пра злачынствы нацыстаў. Але менавіта мінулы год даў штуршок. На прыкладзе вёсак Магілёўскага раёна ён паказаў, што гэта пытанне сапраўды не цалкам вывучана. Тут, дарэчы, знаходзіцца і яго малая радзіма — вёска Куты. А што можа быць цікавей для гісторыка, чым родныя мясціны? Шукаў звесткі па архівах, электронных базах, на мясцовых могілках. Атрымалася ўстанавіць дзесяць, раней не ўлічаных прозвішчаў ахвяр генацыду.**

### Чорны лёс вёсак Закуцце і Куты

На гэтую тэму лепш размаўляць не ў кабінеце. І мы з сенатарам адправіліся па тых вёсках, дзе вайна пакінула свае чорныя сляды. Тут шмат воінскіх пахаванняў, дзе на гранітных плітах дробным почыркам напісаны сотні прозвішчаў. А колькі іх насамрэч, нават цяжка падлічыць. Зараз, калі пытанне генацыду вывучаецца больш дасканала і змястоўна, усплываюць дзясяткі новых імёнаў.

— Летась я пачаў працаваць у архіве ЗАГСа Магілёўскага раёна і падняў карткі па 1942-1943 гадах, — расказвае Алег Дзячэнка. — Ёсць таксама банк даных, які створаны Нацыянальным архівам Рэспублікі Беларусь па пасляваенных дакументах, выніках работы


Уладзімір ЦІТОЎ зацікавіўся лёсам продкаў ужо на пенсіі.

спецыяльных ваенных камісій, і спісы вёсак, якія былі спалены, але звесткі там не заўсёды поўныя. Напрыклад, па вёсцы Закуцце згадваецца, што немцы забілі тут двух чалавек, а я па метрычных запісах і картках знайшоў яшчэ 10. Прагледзячы іх, звярнуў увагу на надпісы: спалены немцамі. Няўлічанымі аказаліся дзеці і дарослыя некалькіх сямей ва ўзросце ад 4 да 60 гадоў.

Закуцце была невялічкая вёска, усяго 11-12 двароў, пасля вайны яна так і не адрадзілася. Тыя, хто цудам ацалеў, аселі ў іншых вёсках або перабраліся ў горад. «Як сведчаць гістарычныя звесткі, немцы спалілі гэтую вёску, бо яна знаходзілася на мяжы некалькіх партызанскіх зон, — кажа Алег Дзячэнка. — На жаль, імёны ваенных злачынцаў, якія зрабілі сваю чорную справу, невядомыя».

З-за высноваго бездарожжа дабрацца да месца, дзе да ліпеня 1943-га знаходзілася вёска Закуцце, на жаль, не атрымалася. Сёння там нічога, акрамя грамадзянскіх могілак, дзе ляжаць у тым ліку і нявінныя ахвяры фашыстаў, няма. Затое па могілках вёскі Куты, ад якой да колішняга Закуцця менш як кіламетр, прайшліся. Тут таксама пахаваныя ахвяры акупантаў.

— Яны згадваюцца ў кнізе «Памяць», але прывязкі да мясцовасці, дзе пахаваныя, не было, — кажа гісторык. — Я гэтыя магілы знайшоў. Засталося ўстанавіць памятныя шыльды.

Адзін з тых, каго расстралялі ў 1942-м годзе немцы, — старшыня калгаса «Сталінскі прызыў» Карней Лянькоў, 1902 года нараджэння. Суразмоўца расказвае, што ў 30-я гады, калі пачалася калектывізацыя, ён быў рэпрэсаваны, але яго не саслалі ў Сібір. Знайшліся дакументы, дзе напісана, што ў 1935 годзе Карней Лянькоў быў народным засядацелем у судзе. А ў 1942-м яго і яшчэ некалькіх жыхароў вёскі Куты расстралялі фашысты. Частку інфармацыі сенатар атрымаў ад сваякоў, частку знайшоў у архіўных дакументах. Доўгая, карпатлівая праца, але важна. Без гэтага наша памяць не будзе поўнай.

— Калі падымаеш такі матэрыял, гэта дае імпульс для далейшых даследаванняў — пашырэнню, паглыбленню матэрыялу, — кажа суразмоўца. — Як было з вёскай



Дошка памяці, якую зрабілі ў Вендаражскай школе.

Закуцце. Згадка пра вёску ёсць, а дзе ж людзі? Пачынаеш падымаць, шукаць і выпадкова знаходзіш.

Могілкі вёсак Закуцце і Куты Алег Дзячэнка ведае так, што можа экскурсіі вадзіць з заплюшчанымі вачыма.

— Вось цікавае пахаванне, — звяртае ўвагу мой гід. — Абодва мужчыны загінулі ў адзін дзень у 1942 годзе, іх немцы расстралялі, але пра Івана Ганакова ёсць інфармацыя ў кнізе «Памяць», а Ісак Камінскі нават не згадваецца.

На могілках шмат невядомых пахаванняў, але сенатар можа распавесці пра многія з іх. Нешта яму расказала мясцовае насельніцтва, нешта супаставіў з архіўнымі фактамі і зрабіў высновы.

— Вось тут пахаваны Цімафей Патапавіч Медзякоў, — паказвае ён на магілу, дзе няма не тое што імя або прозвішча, але нават і крыжа. Кавалачак зямлі, абкладзены каменем. — Мне яго ўнук паказаў, а ўнуку — яго маці. Дзед быў настаўнікам, расстраляны за сувязь з партызанамі. Унук збіраецца помнік яму паставіць.

— Праблема, што старыя сышлі ўжо з жыцця, а разам з імі — і карысная інфармацыя, — перажывае суразмоўца. — Вярнуцца б сюды ў 80-я — мы б усё аднавілі. Калі знаходжу чалавека, які нешта можа расказаць, адразу ж вязу яго сюды. Але часцей даныя знаходжу ў архівах або на сайтах накшталт «Памяць народа», дзе ёсць узнагародныя дакументы або даныя аб удзеле земляка ў Вялікай Айчыннай вайне. Нават месцы пахаванняў згадваюцца. У Нацыянальным гістарычным архіве па метрычных кнігах вызначаў радавыя сувязі. Паступова карцінка, як пазлы, складвалася. Работа вельмі карпатлівая. Але адчуваю, што мне быццам нешта дапамагае. У 2019-м, калі я толькі пачаў усім гэтым займацца, мяне абралі ў Савет Рэспублікі ад Чавускага і Магілёўскага раёнаў. Гэта якраз тыя тэрыторыі, якія мне цікавыя як гісторыку. З таго часу пакрысе вяртаю з небыцця людзей, і яны нібыта пачынаюць жыць новым жыццём.


Алег ДЗЯЧЭНКА вяртае ахвярам генацыду імёны.

### Гэта трэба жывым

Нехта скажа: каму сёння патрэбна гэтая інфармацыя? Ужо і дзяцей тых, хто загінуў ад рук фашыстаў, амаль няма. А ўнукам-праўнукам гэта, мабыць, нецікава. Але Алег Дзячэнка можа прывесці іншыя прыклады. Унук партызана Івана Фёдаравіча Свіршчава быў вельмі ўдзячны за звесткі пра сваіх дзеда і прадзеда. Прычым Алег Дзячэнка сам выйшаў на яго.

— У вёсцы не знайшлося нікога, хто змог бы мне расказаць пра Івана Свіршчава, на магіле якога знаходзіцца вялікі помнік, — расказвае суразмоўца. — На базе сайта «Памяць народа» я ўстанавіў, што Іван Фёдаравіч быў партызанам, загінуў 6 мая 1944 года і быў пахаваны тут. А яго бацька Фёдар Восіпавіч у тым жа годзе памёр ад тыфу. Калі размаўляў з унукам, ён прызнаўся, што нічога не ведаў пра гэта, і для яго гэтыя звесткі вельмі каштоўныя...

Сярод тых, каму дапамог Алег Дзячэнка, і жыхар вёскі Дубінка Магілёўскага раёна Уладзімір Цітоў. Мужчына знайшоў дзеда па матулінай лініі, які лічыўся зніклым без вестак. Аказалася, што ён ваяваў у партызанскім атрадзе Асмана Касаева і загінуў. Пахаваны ў брацкай магіле на тэрыторыі Бялыніцкага раёна. Нядаўна Уладзімір Мікалаевіч з'ездзіў туды, каб ушанаваць яго памяць. Кажа, што, калі б не Алег Дзячэнка і Віктар Пінчук, старшыня Савета ветэранаў Магілёўскага раёна, яго дзед і далей бы лічыўся зніклым без звестак.

Наогул, вайна моцна апаліла сям'ю Уладзіміра Цітова. У вёсцы Дубінка падчас карніцкай аперацыі ў 1943-м годзе загінула яго бабуля па бацькоўскай лініі — Сцепаніда Цітова. Яе прозвішча ёсць на гранітных дошках гэтага мемарыяла. Цудам пазбеглі гэтай долі маці вяскоўца і яго бабуля па мацярынскай лініі. Цяпер ён аднаўляе бацькавы дакументы, які ў гады вайны быў у партызанах, а потым ваяваў на фронце. З вайны вярнуўся з ордэнам Вялікай Айчыннай вайны, медалямі «За адвагу» і «За Перамогу над Германіяй». Пасля вайны працаваў у калгасе брыгадзірам.


На могілках шмат абязлічаных пахаванняў.

Уладзімір Цітоў лічыць, што павінна быць ушанаваная памяць не толькі тых, хто загінуў падчас вайны, але і тых, хто ваяваў, застаўся жывы і аднаўляў савецкую гаспадарку. І ў гэтым яго падтрымлівае Алег Дзячэнка. Зараз вырашаецца пытанне, як гэта зрабіць. Тое, што меркаванне вельмі справядлівае і правільнае, не падвяргаецца сумневу.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара і з архіва Алега ДЗЯЧЭНКІ.**
*Магілёўскі раён.*

### Неабходны каментарый

**Намеснік старшыні Магілёўскага райвыканкама Аляксандр АЛЕКСА:**

— На тэрыторыі Магілёўскага раёна 196 памятных знакаў і воінскіх пахаванняў. Усе яны замацаваныя за прадпрыемствамі, арганізацыямі, школамі і знаходзяцца пад пастаянным наглядам. Тут праводзяцца мітынгі, акцыі, хвіліны мужнасці — гэтыя месцы заўсёды ў цэнтры ўвагі. У раёне шмат чаго робіцца для захавання гістарычнай памяці. Летась мы выдалі Кнігу працоўнай славы, у якую занесены прозвішчы болей чым 600 чалавек. Гэта тыя людзі, якія з 1945 года да сёння, працуючы ў Магілёўскім раёне, удастоіліся найвышэйшых дзяржаўных узнагарод. Збіраць даныя дапамагалі і школьнікі. Яны ўцягнутыя ў працэс захавання гістарычнай памяці і цалкам паглыбляюцца ў прадмет сваіх даследаванняў. Было знойдзена шмат цікавай інфармацыі падчас стварэння гістарычнай экспазіцыі ў аграгарадку Дашкаўка. У рабоце было задзейнічана некалькі школ. Вучні школ раёна працавалі таксама над стварэннем макетаў спаленых вёсак. Напрыклад, Вендаражская школа аднавіла даваенны выгляд вёскі Дубінка, якая была спалена карнікамі ў лютым 1943 года. Пад кіраўніцтвам дырэктара школы Вячаслава Арлоўскага збіралася інфармацыя для Дошкі памяці, якая ўстаноўлена каля будынка ўстановы, а таксама для тутэйшай музейнай экспазіцыі. Дзеці цалкам ахоплены важнай пошукавай работай — толькі так можна прасякнуцца любоўю да сваёй малой радзімы. Гэта не проста прыйшоў і паклаў кветку да мемарыяла. Тут будзеш дакладна ўсё ведаць і помніць, а потым яшчэ і сваім дзецям расказваць. Знаходзім новыя гераічныя імёны, адкрываем новыя дошкі памяці. Наша задача — не забыцца ні пра каго.

# ВАРТАСЦЬ ІНІЦЫЯТЫВЫ І ПРЫКЛАДУ

## Як грамада разам з мясцовай уладай паспрыялі стварэнню новага аблічча парку ў Амяльной і адраджэнню Гошчы

**Каб у вёсцы кожны вечар, у цэнтральнай яе частцы і ўздоўж парку, выходзілі на шпацыр пенсіянеры, — далёка не ўсюды пачуеш пра такое. А ў Амяльной (дарэчы, гэта адзін з самых аддаленых ад райцэнтра сельсаветаў Івацэвіцкага раёна) такія прагулкі апошнім часам сталі традыцыяй. Прыгожа, чыста, дагледжана — чаму б не прайсціся, убачыцца са знаёмымі, перакінуцца парай слоў пра жыццё?**

### Тутэйшы Лас-Вегас

Настаўніца-пенсіянерка Галіна Сарока асабліва высока ацаніла навагодняе афармленне, а таксама святочную ілюмінацыю вёскі. «Сваёй сястры, якая жыве ў даволі вялікім горадзе, расказваю, а яна не верыць, — смяялася Галіна Іосіфаўна. — Здзіўляецца, што я гуляю зімой у дзевяць вечара. У яе ўяўленні вёска зімой — гэта суцэльная цемра альбо адзін ліхтар недзе ў цэнтры. Кажу ёй, што ў нас нібы Лас-Вегас тут: усё свеціцца і зіхаціць. Давялося відэа здымаць ды скідваць па вайберы.

Сапраўды, сёлета пастараліся ўсе установы і арганізацыі, якія працуюць на тэрыторыі, зрабіць свой унёсак у навагодняе афармленне населенага пункта, расказалі ў сельвыканкаме. Усё было падсветлена, на плошчы стаяла ёлка. Кірунак задаў адміністрацыйны будынак ААТ «Мічурынск», яны падсвяцілі таксама майстэрню, зернясток, інтэрнат, за імі пайшлі школа, садок, іншыя. Аказалася, што стварыць настрой не так і дорага — варта праявіць зацікаўленасць, прыкласці фантазію і рукі.

Такое святочнае афармленне стала свайго роду лагічным працягам добраўпарадкавання, якое праведзена за апошнія гады. Знешні выгляд вёскі непараўнальна змяніўся пасля добраўпарадкавання парку. Ён даволі стары і працяглы, прымыкае да цэнтральнай часткі населенага пункта. Пасля ўрагану 1997 года парк аказаўся крыху запушчаным, а за дваццаць гадоў прырода зрабіла сваю справу: буралом зарос кустоўем і травой, месцамі ўтварыліся гэткія астраўкі джунгляў. Грунтоўна ўзялася за яго мясцовая ўлада ў 2018 годзе.

### Парадак у парку і пляцоўка для дзяцей

— Спачатку я разлічвала на мінімальнае. Хоць бы прыбраць і прарэдзіць зараснікі, — кажа **старшыня Амяльнянскага сельскага Савета Валянціна ГАРОШКА.** — Уявіце сабе: дзіцячага садка, які зараз праглядаецца праз парк, не было відаць зусім. З таго боку — адпаведная карціна. Дык вось выхавальнікі расказвалі: калі расчысцілі, прыбралі лішняе, дзяцей было не адарваць ад вокнаў. Малыя паказвалі адно аднаму дарогу: стала відаць, якія машыны, трактары праходзяць. Яны ж прывыклі бачыць у вокнах суцэльны зараснікаў.

Працавалі на расчыстцы ўсёй грамадой, не раз выходзілі на суботнікі. А калі сталі вымалёўвацца абрысы новага памаладзелага парку, было агучана пажаданне ўсталяваць хоць некалькі лавак, каб было дзе адпачыць, напрыклад, па дарозе з крамы. Першыя дзве лаўкі набылі за кошт сельвыканкама. На дзве наступныя матэрыялы далі індывідуальныя прадпрымальнікі, якія займаюцца дрэваапрацоўкай.

Разам з гэтым будавалі дзіцячую пляцоўку побач са школай, дзіцячым садком. Тут ужо найбольшая заслуга ААТ «Мічурынск». Асноўныя работы, якія патрабуюць кваліфікацыі, правяла будаўнічая брыгада гаспадаркі. Астатняе рабілі тыя ж будаўнікі разам з вяскоўцамі вечарамі, пасля работы. Самы актыўны ўдзел прымаў дырэктар ААТ, дэпутат сельскага Савета Дзмітрый Бурчук. Адным словам, пляцоўка атрымалася на радасць дзятве.

### Эксклюзіўныя альтанкі

Паралельна працягвалася добраўпарадкаванне парку. Раённы цэнтр занятасці прыслаў па праграме грамадскіх аплатных работ чалавека, які стаяў на ўліку ў якасці беспрацоўнага. Аказалася, што Міхаіл Каверчык мае талент работы з дрэвам. Да кожнай лаўкі, стала, альтанкі, якія неўзабаве з'явіліся ў парку, ён падыходзіў творча. Скажам, ляжала даўно паваленае дрэва. Толькі хацелі адвезці да кацельні, а ён крычыць: «Не чапайце, я лаўку альбо арэлі для дзяцей зраблю!» І праўда, праз колькі дзён з дапамогай пілы, сякеры, малатка з-пад яго рук выходзіць калі



Дзеці ў парку.

не твор мастацтва, то зручная для людзей рэч. Самая першая альтанка з круглымі сталамі, размешчанымі на пянёках, атрымалася настолькі эксклюзіўнай, што яе адразу ацаніла моладзь. З надыходам цяпла яна не прастойвае, тут заўсёды бываюць наведвальнікі. Ды і не толькі юныя адпачывальнікі займаюць альтанку. Скажам, невялікія калектывы самых розных вясковых устаноў нават прафесійныя святы там адзначаюць. Тут прыемна пасядзець на прыродзе, можна пасмажыць шашлык, карацей, усё ёсць для культурнага адпачынку.

Пасля першай альтанкі сталі з'яўляцца новыя. Важна, як той казаў, увайсці ў смак. Гэтая, як было сказана, прыйшлася даспадобы моладзі. Пенсіянеры заказалі месца адпачынку крыху ў іншым стылі. Патрабавалася не толькі рабочая сіла, але і матэрыялы, сродкі. Наперш адгукнуліся індывідуальныя прадпрымальнікі. Гаспадыня прыватнага магазіна Надзея Трашчанка набывала асобныя матэрыялы як для дзіцячай пляцоўкі, так і для паркавых лавак.

— Уладкаванне парку захапіла ўсіх жыхароў, — кажа Валянціна Гарошка. — Калі мы сабраліся пафарбаваць драўляныя лаўкі, альтанкі, ужо хацелі фарбу купляць, прыйшоў адзін прадпрымальнік і прапанаваў спецыяльнае насычванне для дрэва, нятаннае, імпартнай вытворчасці. Атрымалася, вядома, больш стыльна. Мясцовыя фермеры таксама дапамагалі. Васіль Камяк прыйшоў і спытаў: «Якая патрэбная дапамога?» Дошкі для даху, металапрофіль купіў ён. Другі наш фермер таксама выдзеліў сродкі. Прадпрымальнікі Сяргей Струнеўскі і Мікалай Савіла выдзелілі піламатэрыялы.

А калі ўсё зрабілі, у сельсавет прыйшла дэлегацыя пенсіянерак. Жанчыны сказалі, што іх унукі будуць усім гэтым карыстацца ўлетку, таму яны гатовыя сабраць грошы і зрабіць свой унёсак у агульную справу.

### Новае жыццё вёскі

Варта яшчэ сказаць, як грамадская ініцыятыва паспрыяла адраджэнню суседняй вёскі Гошчы, дзе заставалася літаральна два-тры дзясяткі жыхароў. Гошчы, несумненна, пашанцавала, што яна размешчана побач з вялікім возерам. Праўда, бераг вадаёму зусім зарастаў, з боку вёскі вады не было відаць за зараснікамі, побач узнікалі стыхійныя звалкі — «заслуга» шматлікіх рыбакоў. І невядома, як было б далей, каб не адзін брастаўчанін, які купіў стары дом на беразе возера. Ён правёў рэканструкцыю дома, расчысціў участак і прыбярэжную паласу, узвёў невялікі пірс. Да яго далучыліся суседзі, спадчыннікі суседніх дамоў паглядзелі на прыгажосць і сталі наводзіць яе ў сябе. Такім чынам, чыстая акультураная прыбярэжная зона пашыралася, паступова вымалёўваўся пляж. Самі жыхары навялі парадак, паставілі некалькі лавак, нават стэнд аформілі з заклікам падтрымліваць чысціню і парадак.

І вось ужо іншыя жыхары вёскі сталі абнаўляць фасад і агародку, прыводзіць у парадак домаўладанні. У той дзень, як мы прыехалі (17 сакавіка. — **Аўт.**), каля аднаго з дамоў працавала тэхніка, значыць, займаюцца вяскоўцы капітальным рамонтам, рэканструкцыяй. Больш за тое, людзі сталі звяртацца ў мясцовую ўладу па ўчасткі пад забудову. Сельвыканкамам ужо выдзеліў пяць такіх участкаў. На адных стаяць падмуркі, іншыя ўжо ўзвялі каробкі дамоў. За лета дамы, хутчэй за ўсё, будуць узведзены. Гаспадары іх жывуць у Мінску, Пінску, Брэсце. Хутчэй за ўсё, будуюць для летняга адпачынку, магчыма, нехта пераедзе з выхадам на пенсію, — разважае кіраўнік мясцовай улады. — Галоўнае, што будзе жыць вёска, не знікне з карты



У парку ў Амяльной.

населены пункт, якому больш за 500 гадоў. Дарэчы, мясцовыя актывісты заказалі шыльдачку з датай першага згадвання пра Гошчу, якую неўзабаве прымацуюць на валун. Галоўнае, што прыклад актыўных грамадзян прымусіў падцягнуцца іншых. Паваленых агароджаў больш няма, кожную вясну падфарбоўваюцца фасады нават старых дамоў, высаджваюцца кветкі.

**Старшыня Івацэвіцкага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр САРОКА** сказаў так:

— Гэта вельмі важна — заўважыць, падтрымаць, накіраваць ініцыятыву людзей, часам узначаліць яе. Тады можна многага дабіцца ў плане паляпшэння тэрыторыі, нават якасці жыцця. Скажам, у нас ёсць невялікая вёска Доўгае. Некалькі гадоў таму, калі аб'явілі суботнік па добраўпарадкаванні могілак, там пражывала 46 чалавек. На суботнік прыйшло 40. Не наведаліся толькі тыя, каму было каля 90 гадоў і зусім хворыя. У вёсцы староста быў вельмі актыўны — так змог арганізаваць грамаду, ды і людзі свядомыя і адказныя. Потым я вазіў у гэтую вёску ўсіх старастаў раёна, каб паказаць, як працуе грамадская ініцыятыва, чаго можна дамагчыся талакой.

Ды і на прыкладзе Амяльнянскага сельсавета мы бачым гэта. Прыйшоў фермер і спытаў: «Якая патрэбна дапамога?». У сельсавет прыйшлі жанчынкі на пенсіі, спыталі, колькі грошай здаць на агульную справу, хоць іх аб гэтым ніхто не прасіў. І калі зрабілі ўсе разам альтанкі ў парку, пляцоўку дзіцячую, то ўсе разам сочаць за парадкам, падтрымліваюць яго, адчуваюць калектыўную адказнасць.

А Гошча — гэта наогул цудоўны прыклад для пераймання. Людзі так уладкавалі набярэжную паласу возера, такую зону адпачынку зрабілі, што паглядзець прыемна. Пры тым, што ў сезон там бывае вялікае мноства рыбакоў, аднак парадак падтрымліваецца, бо гэта цудоўная мясціна — агульны набытак.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

*Івацэвіцкі раён.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРНІКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**www.zviazda.by**

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, праспект. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 29 сакавіка 2022 года.**

Бацькаўшчына

*У пошуках страчанага*

# ЗАЗІРНЕМ У СТОЎБЦЫ

**Заснаванае ўдавою крычаўскага старасты Мікалая Слушкі Гальшкай Кміцянкай, мястэчка Стоўбцы вядомасць сваю мае з 1593 года. Яшчэ раней тэрыторыя паселішча належала Мікалаю Крыштофу Радзівілу. А да Слушкаў адышла ў 1582 годзе. Яны і гаспадарылі тут да першай паловы XVIII стагоддзя.**

